

ДОМ ДЛЯ КУРСАНТАЎ

4

КУРАГА — СЯБРОЎКА ГІПЕРТОНІКА



7


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЛІСТАПАДА 2022 г. АЎТОРАК № 229 (29851)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Па выніках дзесяці месяцаў аднаўленчыя тэндэнцыі ў эканоміцы захоўваюцца. Асноўным драйверам выступае прамысловасць. У параўнанні са студзенем — вераснем яна дадала 0,2 працэнтнага пункта. Другі месяц запар станоўчая дынаміка назіраецца ў прадпрыемстваў Мінпрама — плюс 0,8 працэнтнага пункта да вераснёўскіх вынікаў. Гэтыя поспехі забяспечыла эфектыўная работа флагманаў машынабудавання — МТЗ, «Гомсельмаша», холдынга «БЕЛАЎТАМАЗ» і іншых. Яны працягнулі нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, і гэта адбілася на выніках знешняга гандлю. Пяць месяцаў запар прырастае экспарт тавараў і паслуг. У верасні да жніўня прыбаўка склала 1,2 %. У лідарах — Мінпрам, «Беллегпрам» і «Беллеспаперапрам».*

# ПАЭТУ БЫЛО КРЫХУ ЗА СОРАК...



Фота БелТА.

У Віцебску прадставілі ўнікальны прыжыццёвы партрэт Якуба Коласа, які напісаў Абрам Бразер, калі паэту было крыху за 40. Каля 95 гадоў карціна захоўвалася ў запасніках мастацкага музея Віцебска. У год 140-годдзя з дня нараджэння паэта мастак-рэстаўратар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Юрый КЕГЕЛЕЎ (*на здымку*) за некалькі месяцаў аднавіў карціну, і яна стала экспанатам выставы ў абласным цэнтры, прысвечанай юбілею паэта.

Ведай нашых!

## ВІКТОРЫЯ ВІКІ

### 17-гадовая беларуска стала абсалютнай чэмпіёнкай свету, перамогшы адразу ў трох праграмах

**Мянушку «Небяспечная Віка» Вікторыя Нікалаева атрымала яшчэ ў 11 гадоў, калі на адным з этапаў Кубка свету па шашках згуляла з дарослымі супернікамі і нечакана для ўсіх стала найлепшай сярод жанчын. І цалкам пацвярджае яго дагэтуль. У канцы кастрычніка на чэмпіянаце свету ў Грузіі 17-гадовая беларуска стала абсалютнай чэмпіёнкай свету, перамогшы адразу ў трох катэгорыях: хуткай, імгненнай і класічнай. Такога ў сусветнай гісторыі шашак яшчэ не было.**

СТАР. 12



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

На слыху

## АСАРТЫМЕНТ ТАВАРАЎ — НА АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛІ

**Члены Савета Рэспублікі трымаюць на асаблівым кантролі маніторынг асартыменту тавараў, заявіла журналістам Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава, паведамляе БелТА.**



Фота БелТА.

«За мінулы тыдзень мы праманіторылі 286 аб'ектаў у 92 раёнах нашай краіны, і членамі Савета Рэспублікі парушэнняў у асартыментным пераліку выяўлена не было. Гэта адназначна. Акрамя членаў Савета Рэспублікі, да такой работы таксама падключыліся работнікі сакратарыята. Мы збіраем інфармацыю, калі размаўляем з людзьмі, выязджаем у рэгіёны. Я сама ў выхадныя дні бываю ў магазінах, у рэгіёнах абавязкова заходжу ў гандлёвыя аб'екты, для таго каб праверыць, наколькі вытрымліваецца сёння асартыментны пералік тавараў, — расказала Наталля Качанава.

СТАР. 2

### КОРАТКА

• Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў тэлефонную размову з Касым-Жамартам Такаевым і павіншаваў яго з перамогай на выбарах Прэзідэнта Казахстана.

• **Наступствы першага буйнога снегападу ў Магілёве ліквідавала больш за 100 адзінак тэхнікі.**

• Беларусь накіравала ў Судан гуманітарны груз для дапамогі пацярпелым ад паводкі.

ISSN 1990 — 763X

22229

9 771990 763008


**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месячавы.**



З першых вуснаў

# «Будзе эканоміка — нам не страшныя ніякія войны»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з кіраўніком Удмурцкай Рэспублікі Аляксандрам Брачалавым. У Палацы Незалежнасці абмеркавалі пашырэнне прамысловай кааперацыі, імпартазамяшчэнне, абмен тэхналогіямі, экспарт паслуг, супрацоўніцтва ў гуманітарнай сферы. Беларускі лідар закрануў і тэмы глабальнага раскладу.**

### «Эканоміка — аснова»

Прывітаўшы дэлегацыю гэтага расійскага рэгіёна, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўважліва вывучыў гісторыю нашых узаемаадносін, узровень, на які выйшлі. Радавацца, па словах беларускага лідара, асабліва няма чаму. «Нягледзячы на невялікі прырост у мінулыя гады, і сёлета недацягваем, а патэнцыял добры: і ва Удмурціі, і ў Беларусі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Таму ёсць над чым працаваць. Эканоміка і гандлёва-эканамічныя адносіны — аснова, таму будзем будаваць свае планы такім чынам, каб тут дабаўляць. Усе астатнія кірункі і нашы адносіны — дай божа, каб яны былі ў іншых дзяржаў на такім узроўні, як у нас сёння з Расіяй і ў прыватнасці з канкрэтным расійскім рэгіёнам».

Па словах кіраўніка дзяржавы, Беларусь вельмі зацікаўленая ў супрацоўніцтве з прадпрыемствамі Удмурціі. «Спадзяюся, што тыя кірункі, якія нам патрэбна развіваць, у працэсе вашага візіту знойдзем, хоць упэўнены, што такія планы вы будаваны, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Вы ведаеце нашы магчымасці: у сферы высокіх тэхналогій, у аўтамабілебудаванні, нават у абаронкай прамысловасці, што вельмі важна на сёння. Ведаю, што вы шмат увагі ўдзяляеце чысціні вашага рэгіёна. Таму нашы аўтобусы, тралейбусы ў тым ліку — у гэтым кірунку мы можам сур'ёзна папрацаваць. Гэта што датычыцца жыцця людзей».

Звярнуў увагу Прэзідэнт і на запатрабаванасць у Расійскай Федэрацыі беларускіх ліфтаў. Беларускі лідар адзначыў, што сёлета, калі нашы так званыя партнёры ад нас сышлі, мы пераарыентавалі свае магчымасці на рынак Расійскай Федэрацыі, у тым ліку і па ліфтах, хоць прадпрыемства было моцна перагружана. «Аднак Расія для нас у гэтых адносінах з'яўляецца прыярытэтам, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І Прэзідэнт Пуцін акурат прасіў аб гэтым, каб мы звярнулі ўвагу на замяшчэнне імпартных ліфтаў Расіі беларускімі. Сваё абяцанне мы выконваем».

Гатовы беларускі бок дапамагаць сваім расійскім партнёрам і ў мадэрнізацыі рухомага саставу, у прыватнасці, аўтобусаў, тралейбусаў. Што датычыцца аграпрамысловага комплексу, ва Удмурціі, як і ў нашай краіне, ён на дастаткова высокім узроўні. «Калі вам нешта спадабаецца ў Беларусі — калі ласка. Не — значыць, будзем у вас вучыцца», — абазначыў сваю пазіцыю ў пытанні ўзаемадзеяння ў АПК беларускі лідар.

Навука, культурнае супрацоўніцтва, ахова здароўя, адукацыя — тыя напрамкі, узаемадзеянне ў якіх, па словах Прэзідэнта, нават не абмяркоўваецца.

«Мы цяпер зразумелі, што нам трэба рабіць, у якім кірунку рухацца, — заўважыў беларускі лідар. — А самае галоўнае — не забываць тое, што было назапашана да нас. А стаяць усё-ткі на плячах тых гігантаў, якія стварылі калісьці нашу агульную краіну». Аляксандр Лукашэнка вылучыў пяць кірункаў, што ўзнімаюць нацыю на абсалютна іншы ўзровень развіцця: біятэхналогіі, атамная энергетыка, космас, ВПК, Парк высокіх тэхналогій. «Мы дадалі да таго, што было, але тое не страцілі, — падкрэсліў беларускі лідар. — У прынцыпе, мы многае можам. Магчыма, не так хутка, хоць час ад нас патрабуе павелічэння хуткасці».

Прэзідэнт перакананы: бягучы год паказаў, што мы цалкам здольныя вырашыць тыя праблемы, якія трэба тэрмінова вырашаць. «І ваш візіт у гэтым плане вельмі важны, — звярнуўся ён да кіраўніка Удмурцкай Рэспублікі. — Вы ўсё-ткі сэрца Расіі. Ваша невялікае па тэрыторыі, вялізнае па сваім патэнцыяле насельніцтва, людзі, якія ў вас жывуць, могуць пасадзейнічаць вырашэнню тых праблем, што востра стаяць перад намі. Яшчэ раз хачу падкрэсліць: мы выстаім перад гэтым націскам з боку так званага калектыўнага Захаду і іншымі нашымі ворагамі не толькі ў ваенных адносінах, але і, перш за ўсё, у эканамічных».

### «Трэба адказаць на элементарныя пытанні»

Прэзідэнт пракаментаваў адзін з апошніх інцыдэнтаў, звязаны з падзеннем ракеты на тэрыторыі Польшчы, які набыў шырокі рэзананс у медыйным полі. Аляксандр Лукашэнка паставіў пытанні, на якія пакуль няма адказу: «Чаго ж гэтая шалёная ракета, пушчаная ўкраінскімі ваеннымі (а стралялі на ўсход — адтуль жа ракеты ляцелі расійскія, збівалі іх у кірунку ўсходу), што ж яна так развярнулася і пайшла ў адваротны бок? Няхай прафесіяналы адкажуць на гэтае пытанне. Такіх выпадковасцяў не бывае. Паўстае пытанне: чаго вы, украінцы, стралялі ў бок натаўскай дзяржавы? І галоўнае пытанне, на якое ніхто не адказвае, і амерыканцы маўчаць: у дадзены момант, калі пуск ракеты С-300 украінцы ажыццяўлялі, па чым яны білі, па якіх аб'ектах? У гэты час не было ракет у паветры. Маўчаць. І амерыканцы маўчаць. Разумеюць, што і мы кантралюем гэтую тэрыторыю, і нешта мы бачым тут».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, патрэбна на тыя элементарныя пытанні адказаць. «Чаму менавіта падчас саміту дваццаткі раптам атакавалі натаўскую дзяржаву, як гэта было першапачаткова прадстаўлена? — заўважае ён. — Я баюся рабіць высновы, але падобна на такі «дагаварняк», што далей няма куды. Але крыху не различылі — людзі загінулі. І палякам трэба адказаць свайму насельніцтву. Кіраўніцтву Польшчы патрэбна адказаць перад палякамі: як магло так адбыцца, чаму білі па тэрыторыі Польшчы, хто дамовіўся, чаму ракета раптам з усходу на захад завярнула і паляцела і чаму ў той момант стралялі, калі ў паветры не было расійскіх ракет?» Толькі пасля адказу на згаданыя пытанні, перакананы беларускі лідар, усё стане зразумелым. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што трэба аддаць належнае прэзідэнту ЗША Джо Байдэну, які шчыра сказаў, што ракета, якая ўпала на тэрыторыю Польшчы, не расійская.

«Супраць нас ідзе бязлітасная вайна, — акцэнтаваў увагу кіраўнік дзяржавы. — Ім трэба нас справакаваць. Патрэбна эскалацыя. Таму нам трэба глядзець на нашых людзей, на нашу эканоміку. Эканоміка — аснова ўсяго. Будзе эканоміка — нам не страшныя ніякія войны».

Звяртаючыся да кіраўніка Удмурцкай Рэспублікі, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што мы — надзейныя людзі і ніколі сваім братам не здраджвалі. «Гэтым шляхам не хадзілі і хадзіць не збіраемся, — падкрэсліў ён. — Будзем разам — хутчэй вырашым нашы праблемы. Спадзяюся, што будзе вельмі добры вынік ад вашага візіту ў Беларусь».

**Вераніка КАНЮТА.**

# АСАРТЫМЕНТ ТАВАРАЎ — НА АСАБЛІВЫМ КАНТРОЛІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мы цяпер сталі маніторыць яшчэ тую інфармацыю, якая размяшчаецца на інтэрнэт-сайтах. Таму што часта яна абсалютна ілжывая і не пацверджаная ніякімі фактамі. Мы такую інфармацыю абавязкова правяраем, накіроўваем для праверкі ў мясцовыя органы ўлады, якія выязджаюць, правяраюць і тут жа нам дасылаюць інфармацыю з тых гандлёвых аб'ектаў не з пустымі паліцамі, а з паліцамі, дзе маса тавараў. Таму, вядома, мы трымаем сітуацыю на кантролі, і Прэзідэнт нашай краіны папрасіў нас актыўна далучыцца да гэтай работы».

Спікер прывяла канкрэтны прыклад. «Мне нядаўна сказалі, што няма пены для галення для мужчын у Мінску. Тут жа адправіла праверыць усе магазіны, паглядзець. Усё ёсць і ў вялікім асартыменце, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Разумееце, тут трэба ставіцца спакойна. Гэта ідзе інфармацыйная вайна, калі нядобрасумленныя людзі проста жадаюць унесці раскол у грамадства для таго, каб тое з'явілася яшчэ адным трыгерам, каб выклікаць неспакой у нашых грамадзян. Абсалютна няма ніякіх падстаў сёння казаць аб тым, што заўтра з паліц крамаў знікнуць нейкія тавары. Больш вам скажу, сустракаючыся сёння з моладдзю, адно з першых пытанняў, якое яны задалі мне: мы чытаем (а яны ж у асноўным чытаюць інтэрнэт), што вось дзесьці знікаюць нейкія тавары з паліц крамаў і заўтра ў нас нечага раптам не стане. На што я ім сказала: для таго каб ведаць праўду, трэба чытаць дзяржаўныя СМІ і глядзець дзяржаўнае тэлебачанне — тады вы будзеце ведаць праўду.

Таму мы займаліся такой работай і абавязкова будзем займацца ў далейшым для таго, каб даносіць да людзей праўду», — канстатавала Наталля Качанава.

«Павінна быць вельмі хуткая рэакцыя. Бо калі пачынаюць з аднаго сайта на іншы перапампоўваць хлусліўую інфармацыю, людзі ўсё гэта бачаць. І нам штодня паступае такая інфармацыя з усіх крыніц, мы яе акумулюем і адразу аддаём для праверкі ў мясцовыя органы ўлады. Тут нават не трэба чакаць нейкіх сігналаў. І не толькі члены Савета Рэспублікі ўключыліся ў гэтую работу, але і супрацоўнікі апарата Савета Рэспублікі. І ў гэтым нічога складанага няма. Мы ўсе з вамі бываем у крамах. І кожны з нас купляе прадукты, тавары першай неабходнасці, іншыя тавары. Таму многія інфармуюць нас па гэтых пытаннях, — расказала Наталля Качанава. — У тым ліку і на прыёмах грамадзян па асабістых пытаннях я задаю ўсім пытанне аб асартыменце ў магазінах. Таму што людзі прыязджаюць з розных рэгіёнаў краіны. Шчыра скажу, што не было ніводнага факта, каб людзі сказалі, што чагосьці няма ў крамах ці чагосьці не хапае».

Разам з тым спікер не выключае, што пры вялікай колькасці гандлёвых кропак у некаторых з іх магчымыя нейкія парушэнні. «На павышэнне цэн мы таксама звяртаем увагу. Калі ты купляеш адзін і той жа тавар, то можаш гэта вызначыць. На нешта павысіліся цэны. Напрыклад, у Нясвіжы на 20 % павысілася цана на воцат. Але разам з тым ёсць зніжэнне цэн на рапсавы алей, на рапсавы алей, на расліннае — у Бабруйску. І такіх прыкладаў магу прыводзіць дастаткова шмат, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — Вядома, у кожны гандлёвы аб'ект нашы прадстаўнікі не зайшлі, магчыма, дзесьці і ёсць нейкія недахопы. Але яны былі яшчэ да пастановы Савета Міністраў, тады яшчэ не было таго ажыятажу, які некаторыя спрабуюць стварыць сёння вакол гандлю, Таму ўсё ў выканаўчай дысцыпліне і тых людзях, якія займаюцца гэтымі пытаннямі. Мы займаліся і будзем займацца маніторынгам так, як таго патрабуе ад нас жыццё. І будзем прымаць меры. У гэтай рабоце мы выкарыстоўваем усе крыніцы для таго, каб валодаць праўдзівай, дакладнай інфармацыяй».

«Вядома, у першую чаргу гэта ўсё накіравана супраць улады. Паглядзіце, калі ў нас сёння няма праблем? Калі мы гаворым аб тым, як завяршыўся сельскагаспадарчы год. Колькі вырашчана збожжа ў гэтым годзе — па 1 т на кожнага жыхара краіны, і нават больш. Тады, калі ў нас такі асартыментны пералік прадуктаў харчавання, якімі мы сёння ганарымся. І якасць цудоўная, і выпускаюць нашы таваравытворцы беларускія. І мы нават наадварот думаем, і такія задачы нам ставіць Прэзідэнт — адпраўляць на экспарт. Але ў першую чаргу мы павінны забяспечыць свой народ таварамі народнага спажывання і прадуктамі харчавання, што і робіцца. Таму падстаў у людзей для панікі няма, — сказала Наталля Качанава. — А тыя нядобрапрыстойныя грамадзяне, якія былі, ёсць і будуць, яны, вядома, жадаюць, каб у краіне штосьці было не так. Але ведаеце, мне здаецца, гэта патугі абсалютна нікчэмныя».

Людзі самі бачаць і разумеюць, як добра жывуць беларусы, зазначыла спікер. «Нават мяркуючы па тым, як да нас прыязджаюць у краіну. Я ў папярэднія выхадныя пабывала ў Гомельскай вобласці (мы праводзілі там мерапрыемствы), у сваёй роднай Віцебскай вобласці дастаткова шмат пабывала ў гандлёвых аб'ектах, размаўляла з прадаўцамі, людзьмі. Яны расказвалі, колькі прыязджае зараз грамадзян з Прыбалтыкі, Польшчы ў Беларусь, якія за выхадныя проста вывозяць нашы тавары. Добра, няхай людзі прыязджаюць. Калі ў іх недахоп гэтых тавараў — мы ж не забараняем нікому. Вы бачыце, што ў нас бязвізавы рэжым. Няхай людзі прыязджаюць і купляюць беларускую прадукцыю добрай якасці. Мы будзем гэтаму толькі рады», — дапоўніла Старшыня Савета Рэспублікі.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Такаеў перамог на выбарах прэзідэнта Казахстана



Дзеючы лідар Казахстана Касым-Жамарт Такаеў перамог на выбарах прэзідэнта краіны з больш чым 80 % галасоў. Пра гэта паведамляе Казінфарм са спасылкай на папярэднія даныя Цэнтральнай выбарчай камісіі Казахстана.

Старшыня ЦВК Казахстана Нурлан Абдыраў праінфармаваў, што за Касым-Жамарта Такаева прагаласавалі 81,31 %, або 6 456 392 чалавекі. Другое месца ў гонцы за прэзідэнцкае крэсла атрымаў кандыдат ад партыі «Ауыл», кіраўнік Асацыяцыі фермераў Казахстана Жыгулі Дайрабаеў, які набраў 3,42 % галасоў. Галасаванне на выбарах прэзідэнта Рэспублікі Казахстан завяршыліся позна ўвечары 20 лістапада. На пасаду кіраўніка дзяржавы прэтэндавалі шэсць кандыдатаў. Яўка выбаршчыкаў склала 69,44 %, або 8 300 000 чалавек.

### Politico спрагназавала гандлёвую вайну паміж ЕС і ЗША з-за закона аб зніжэнні інфляцыі

Берлін пачаў рыхтавацца да адказу Вашынгтону на ўступленне ў сілу амерыканскага закона аб зніжэнні інфляцыі 1 студзеня, што можа прывесці да гандлёвай вайны паміж ЗША і Еўрасаюзам, напісала газета Politico. Як піша выданне, 1 студзеня на тэрыторыі ЗША набудзе сілу дакумент аб выдзяленні субсідый і падатковых ільгот у памеры $369 млрд для падтрымкі зялёнага бізнесу ў ЗША. Немцы баяцца, што ў такім выпадку вырасце аб'ём продажаў электрамабіляў амерыканскіх вытворцаў.

Пры гэтым некаторыя вядучыя кампаніі Германіі з-за скачка цэн на энерганосьбіты вымушаны згортваць вытворчасць. На гэтым фоне Берлін (як эканамічны лакаматыў ЕС) хоча, каб Вашынгтон даў магчымасць карыстання амерыканскімі льготамі еўрапейскім кампаніям. Аднак, адзначылі ў Politico, такое развіццё падзей падаецца малаверагодным.

# «Наша работа павінна быць патрэбнай і прыносіць вынікі»

## Наталля Качанава сустрэлася з членамі Маладзёжнага парламента

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла сустрэчу з прэзідыумам Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь.**

Звяртаючыся да ўдзельнікаў, Наталля Качанава адзначыла:

— Нам разам з вамі трэба рабіць усё для таго, каб людзям даносіць праўду, бачыць вузкія месцы, якія мы можам разам з вамі вырашаць. А ваша задача, вядома, — працаваць з аднагодкамі, моладдзю. Я хацела б пачуць сёння, якія праблемы ў вас з'явіліся, якія прапановы ёсць па нашай асноўнай рабоце над законапраектамі. Мы дамовіліся ў цэлым, што, калі ў вас будуць нейкія ініцыятывы, якія будуць цікавыя, вядома, мы будзем вас падтрымліваць. У папярэднім скліканні было 70 чалавек, цяпер ужо ёсць прадстаўнікі ад усіх рэгіёнаў краіны: з кожнага горада, раёна. Хочацца даведацца, як у вас складваюцца ўзаемаадносіны, ці дастаткова вы мабільныя, як даносіце інфармацыю да моладзі свайго горада, раёна. Таму што наша работа павінна быць патрэбнай і прыносіць вынікі.

Дзейнасць Маладзёжнага савета накіравана на работу з моладдзю: члены савета сустракаюцца са школьнікамі, праводзяць адукацыйныя мерапрыемствы, бяруць удзел у асабістых прыёмах грамадзян Савета Рэспублікі.

— Мы з вамі дамовіліся, што будзем сустракацца, каб абмяркоўваць пытанні, якія з'явіліся. Пачаў работу новы састаў Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе. Для кагосьці гэтая работа не новая, таму што вы працавалі ў папярэднім скліканні, для кагосьці абсалютна новая. Але разам з тым я бачу, што вы актыўна ўключыліся, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Я бачу, як асвятляецца ваша дзейнасць у СМІ. Калі мы праводзім выязныя прэзідыумы, прыёмы па асабістых пытаннях, вы заўсёды з намі. Гэта вельмі важна.

**Арына КАРПОВІЧ.**

*Больш падрабязна аб сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі з Маладзёжным саветам чытайце ў заўтрашнім выпуску «Мясцовага самакіравання».*

Нараджэнне традыцыі

# Краіны надзейная апора

## Першы рэспубліканскі форум працаўніц вёскі прайшоў у Мінску

**Напярэдадні Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці АПК у Беларусі адкрыўся першы рэспубліканскі форум працаўніц вёскі. Форум двухдзённы і з насычанай праграмай. У пятніцу вечарам у Вялікім тэатры сабраліся прадстаўніцы розных прафесій сферы сельскай гаспадаркі з усіх рэгіёнаў краіны — жывёлаводы, заатэхнікі, лабаранты, аператары машыннага даення, кіраўнікі малочнатаварных комплексаў. Форум аб'яднаў тысячу ўдзельніц. Ключавая мэта з'езда — ушанаванне працаўніц, якія штодня клапоцяцца аб харчовай бяспецы нашай краіны.**



«У сельскай гаспадарцы вельмі многае залежыць ад жанчын. Дарэчы, у гэтай сферы ў Беларусі іх працуе шмат. Сярод іх аператары машыннага даення, жывёлаводы, кіраўнікі прадпрыемстваў, а таксама кіраўнікі брэндавых перапрацоўчых заводаў», — сказаў **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО,** выступаючы на адкрыцці форуму.

Міністр адзначыў, што для жанчын у аграрным сектары створаны ўсе ўмовы. «Нашы жанчыны сёння могуць працаваць усюды. Ім даюцца вялікія магчымасці для рэалізацыі і ўсе ўмовы для якаснай і эфектыўнай работы незалежна ад месца — малочнатаварны гэта комплекс, малочнатаварная ферма, свінагадоўчы комплекс або птушкагадоўчае прадпрыемства», — падкрэсліў Ігар Брыло.

Вітала ўдзельніц першага форуму працаўніц вёскі і **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА.** «Упэўненая, што гэта стане добрай традыцыяй — напярэдадні прафесійнага свята збірацца ўсім разам, каб сказаць добрыя словы на адрас нашых цудоўных жанчын, — сказала яна, падзякаваўшы Беларускаму саюзу жанчын за ідэю правесці такі форум.

«Прэзідэнт калісьці зрабіў стаўку на развіццё сельскай гаспадаркі, і сёння яна абсалютна апраўданая. Мы забяспечваем харчовую бяспеку краіны, умацоўваем эканоміку. Прадукты, якія мы пастаўляем на экспарт, сталі сапраўднымі брэндамі. Мы ганарымся гэтым. А жанчыны, як заўсёды, на перадавой, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Мілыя жанчыны, складана ўявіць, што на вашых далікатных плячах ляжыць такая няпростая работа. Але калі бываеш на сельскагаспадарчых прадпрыемствах і бачыш, якія вы прыгожыя, разумныя, адданыя сваёй роднай краіне і свайму народу, то разумееш, што наша зямля ў надзейных руках».

**Старшыня Беларускага саюза жанчын Вольга ШПІЛЕЎСКАЯ** адзначыла: «Устойлівыя характарам, гарачыя сэрцам, з прыгожай пастаццю, вы заўсёды гатовыя прыйсці на дапамогу і паклапаціцца пра блізкага. А галоўнае — вы тыя, хто разумее, што такое зямля-карміцелька, што такое родны край і сапраўдная любоў да Беларусі».

Удзельніц форуму чакалі новыя знаёмствы і насычаная праграма. У Вялікім тэатры вясковыя працаўніцы ўбачылі балет «Шчаўкунок», а назаўтра наведалі храм Усіх Святых і Музей Вялікай Айчыннай вайны. Уражанні жанчыны атрымалі незабыўныя. Многія выказвалі спадзяванні, што мерапрыемства стане добрай штогадовай традыцыяй.

**Паводле БелТА.**

Дэпутат у акрузе

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ І СУСВЕТНАЕ ЗОЛАТА

## Аб некаторых аспектах работы ў сваёй акрузе расказала парламентарый Валянціна БЯГЕБА

**Як вядома, вялікая частка работы парламентарыя праходзіць у яго акрузе. Сёння менавіта пра гэта размова з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па Пінскай сельскай выбарчай акрузе № 15 Валянцінай БЯГЕБАЙ.**

***— У Год гістарычнай памяці асаблівая ўвага аддаецца памятным, ваенна-патрыятычным мерапрыемствам. Якія вы наведалі апошнім часам, што робіцца ў акрузе па захаванні памяці?***

— У кастрычніку мы ўсе смуткавалі з прычыны 80-годдзя знішчэння Пінскага гета. На мітынгу сабралася шмат людзей, што і нядзіўна. Пінская зямля шчодра паліта крывёй абаронцаў Айчыны ў розныя перыяды гісторыі. Але яшчэ больш наша зямля прыняла праху пакутнікаў ваеннага ліхалецця. Гэта мірныя, ні ў чым не павінныя ахвяры вайны, якіх пазбавілі права жыць і працягваць свой род. Самыя страшныя падзеі адбываліся на Піншчыне падчас Другой сусветнай вайны, калі наш край аказаўся пад акупацыяй нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны ўчынілі сапраўдны тэрор мірнага насельніцтва і генацыд біблейскіх маштабаў. Дастаткова сказаць, што на Піншчыне было забіта больш людзей, чым пражывала ў горадзе да вайны. Паводле найноўшых даследаванняў, у рэгіёне карнікамі забіта каля 72 тысяч людзей розных нацыянальнасцяў, у тым ліку ваеннапалонных.

Тыя калектыўныя жахі і асабістыя трагедыі, якія адбываліся ва ўрочышчы Добрая Воля, сёння цяжка ўявіць чалавеку, які жыве пад мірным небам Беларусі. Вывучэннем сусветнай трагедыі, якую захопнікі цынічна называлі аперацыяй па ліквідацыі Пінскага гета, займаліся вучоныя і даследчыкі розных краін і пакаленняў. Але сёння гэтаму ваеннаму злачынству беларускай дзяржавай удзяляецца асаблівая ўвага. Гэта не толькі выклік часу, але і запыт беларускага грамадства. Наш агульны абавязак — не дазволіць сцерці памяць пра загінулых ды нявінна забітых і не дапусціць паўтору чорных старонак гісторыі мінулага.



***— Што ж, на ваш погляд, трэба рабіць у першую чаргу для захавання памяці?***

— Трэба гаварыць з моладдзю, паказваць на прыкладах з гісторыі, што такое фашызм, нацызм, што рабілася на нашай зямлі ў 40-х гадах мінулага стагоддзя. У гэтым сэнсе асаблівую ролю бачу ў рабоце музеяў, клубаў, грамадскіх арганізацый. Летась, напрыклад, на базе ДТСААФ у Пінску быў арганізаваны клуб «Палескі салдат». Яго арганізатар, сапраўдны энтузіяст гісторыі свайго краю Аляксандр Антаноўскі зрабіў цікавую экспазіцыю артэфактаў, якія знойдзены на тэрыторыі раёна. Сярод іх, напрыклад, каска байца Чырвонай Арміі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, прадметы часоў Першай сусветнай. Вывучэнне гісторыі кіраўнік клуба наладзіў з моладдзю менавіта вакол такіх вось экспанатаў. І падлеткі цягнуцца сюды, захапляюцца гісторыяй, вывучаюць яе не фармальна, а з цікавасцю, з энтузіязмам, якім дзеліцца з імі кіраўнік ваенна-гістарычнага клуба.

***— Вы наведваеце маладзёжныя аб'яднанні, грамадскія арганізацыі, працуеце з насельніцтвам у розных формах. А на прыёмах аб чым людзі гавораць з дэпутатам, на што скардзяцца ці больш прапануюць?***

— За перыяд маёй работы ў акрузе было праведзена каля трох дзясяткаў асабістых прыёмаў, на якія прыйшло 460 грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб. Разгледжана таксама 135 зваротаў грамадзян, у тым ліку пісьмовых, вусных, электронных. Пытанні ўздымаюць вельмі розныя — ад змяненняў у заканадаўстве да работы таго ці іншага ўчастка камунальнай гаспадаркі. Напрыклад, на апошнім прыёме, які адбыўся 14 лістапада, таксама прагучала прапанова па змяненнях у дзеючае заканадаўства. Таксама былі просьбы па шэрагу бытавых пытанняў. Усім грамадзянам дадзены адпаведныя адказы. Такія прамыя кантакты з выбаршчыкамі вельмі важныя.

***— Такім чынам, можна зрабіць высноду, што ў акрузе вы працуеце ў цесным кантакце з выканаўчымі органамі ўлады...***

— А таксама з Саветамі ўсіх узроўняў, грамадскімі арганізацыямі, кіраўнікамі прадпрыемстваў і арганізацый. Гэта дазваляе бачыць, ацэньваць, вызначаць дзейснасць прынятых заканадаўчых актаў, іх уздзеянне на развіццё тэрыторыі і паляпшэнне жыцця людзей, а таксама вырашаць актуальныя праблемы, якія агучваюць людзі на прыёмах. Таму я заўсёды, калі ёсць магчымасць, бываю на пасяджэннях райвыканкама. Скажам, на пасяджэнні 14 лістапада гаварылі пра меліярацыю земляў.

Пінскі раён, дарэчы, мае самы высокі ўзровень меліярацыі ў краіне.

***— Наколькі мне вядома, вы, Валянціна Канстанцінаўна, цёпла павіншавалі землякоў-аграрыяў з прафесійным святам. Што асабліва радуе ў сельскай гаспадарцы акругі?***

— Заўсёды нагадваю словы нашага Прэзідэнта пра тое, што збожжа ў цяперашніх умовах — гэта сусветнае золата. Апошняе датычыцца і нашага раёна, які ўносіць значны ўклад у агульную скарбніцу. Сельская гаспадарка — вядучая галіна эканомікі раёна. 19 сельгаспрадпрыемстваў і 102 фермерскія (сялянскія) гаспадаркі вырошчваюць хлеб, іншыя сельгаскультуры, пастаўляюць дзяржаве малако і мяса. Аграрны сектар увесь час развіваецца. Толькі сёлета завершана будаўніцтва сучасных высокапрадукцыйных ферм у гаспадарках «Ахова» і «Лагішын», завяршаецца рэканструкцыя малочнатаварнай фермы ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Пачапава». Сёння Пінскі раён лідзіруе ў Беларусі па вырошчванні буйной рагатай жывёлы. Агульнае яе пагалоўе набліжаецца да ста тысяч. У Пінскім раёне працуе самы высокапрадукцыйны свінакомплекс краіны. Гэта комплекс «Бакінічы», які за дзесяць месяцаў сёлета выпусціў без малога чатыры тысячы тон прадукцыі. Другі такі комплекс узводзіцца ў раёне вёскі Вялікія Дзіковічы.

Таксама сабралі дастойны ўраджай збожжа, яго вал перавысіў 106 тысяч тон. У Пінскім раёне знаходзіцца самая вялікая ў Еўропе плантацыя журавін, закладзены новыя фруктовыя сады. Так што наш рэгіён не толькі забяспечвае суайчыннікаў, але і шмат чаго можа прапанаваць на экспарт.

***— А наладжванню міжнародных сувязяў спрыяе ў тым ліку і Палата прадстаўнікоў. Вы ўдзельнічалі ў рабоце з дэлегацыяй з Ніжняга Ноўгарада. Ці можна гаварыць пра пэўныя вынікі?***

— Такая работа зараз надзвычай актуальная. Па ініцыятыве Палаты прадстаўнікоў адбыўся візіт у нашу краіну дэлегацыі ўрада Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Названая дэлегацыя 26 кастрычніка наведала Пінск. Асноўнай мэтай візіту было наладжванне ўзаемавыгадных сувязяў. Расійскія госці наведалі Пінскае сельскагаспадарчае аддзяленне прадпрыемства «Белкаапфутра», Пінскі вінаробчы завод, завод «Белмедінструменты», сельгасарганізацыі «Пачапава» і «Палескія журавіны».

У нашай гутарцы за круглым сталом пасля наведванняў аб'ектаў кіраўнік дэлегацыі Андрэй Дудкін адзначыў, што пасля гэтага азнаямленчага візіту сюды прыедуць бізнесмены з Ніжагародскай вобласці і правядуць камерцыйныя перамовы. Запыт у бізнес-супольнасці ёсць. А беларускую прадукцыю — мясную, малочную, кандытарскую — у Расіі ведаюць і любяць. І вось 16 лістапада адбыўся другі візіт прадстаўнікоў Ніжагародскай вобласці. Значыць, работа атрымала добры імпульс і рухаецца ў патрэбным кірунку.

**Святлаана ЯСКЕВІЧ.**

Традыцыі

# НА ВЕРНАСЦЬ АЙЧЫНЕ

## Цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі адбылася ва ўсіх злучэннях і воінскіх часцях Узброеных Сіл

**Клятву на вернасць Радзіме і беларускаму народу вымавіла больш як шэсць тысяч маладых людзей, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве. Найбольш масавая і відовішчная цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі адбылася ў 72-м гвардзейскім Аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў. На пляцы вучэбнага злучэння прысягнула на вернасць Айчыне каля дзвюх тысяч навабранцаў.**

З гэтай знакавай падзеяй у жыцці кожнага маладога чалавека іх павіншаваў **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН**. «Гэта складаны і ў той жа час вельмі адказны крок у вашым жыцці, — звярнуўся да военнаслужачых кіраўнік абароннага ведамства. — Ваенная служба — цяжкая мужчынская работа. Наперадзе ў вас напружаная баявая вучоба, удзел у вучэннях, асваенне сучаснай тэхнікі. Будзе нялёгка, часам вельмі складана. Але я ўпэўнены ў кожным з вас. Я ўпэўнены, што ў страі стаяць сапраўдныя мужчыны, сапраўдныя патрыёты сваёй краіны».

Паводле слоў міністра, абарона Айчыны — абавязацельства і святы абавязак грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. «Так было і так будзе заўсёды, — падкрэсліў ён. — На фоне няпростай абстаноўкі каля нашых граніц у Беларусі забяспечаны мір, стабільнасць, спакой і згода. І наша задача — і надалей забяспечваць гэтыя галоўныя прыярытэты».

Віктар Хрэнін заўважыў, што сёння беларуская армія мае ўсё неабходнае для абароны сваёй Айчыны. «Яна мабільная і абсталявана самымі сучаснымі ўзорамі зброі і ваеннай тэхнікі, — удакладніў міністр абароны. — Аднак галоўная каштоўнасць — гэта людзі: тыя, хто сёння выконвае вучэбна-баявыя задачы, тыя, хто нясе баявое дзяжурства».

Кіраўнік ваеннага ведамства звярнуў увагу, што сёння маладыя людзі ўзялі на сябе абавязак са зброяй у руках абараняць галоўныя каштоўнасці суверэннай і незалежнай Беларусі: мір, спакой і стабільнасць. Таксама Віктар Хрэнін выказаў глыбокую ўдзячнасць бацькам за выхаванне сыноў — сапраўдных патрыётаў, якія разумеюць значэнне службы ў радах Узброеных Сіл для гарантавання бяспекі нашай Радзімы.


Фота БелТА.

У размове з журналістамі міністр абароны адзначыў, што прызыўная кампанія і пачатковая падрыхтоўка новага папаўнення праходзілі ў няпросты час. Аднак, нягледзячы на гэта, па яго словах, рады Узброеных Сіл папоўнілі маладыя людзі з высокай матывацыяй, якія разумеюць значнасць ваеннай службы, а таксама тое, што абарона сваіх родных і блізкіх, сваёй Радзімы — вельмі важная задача.

«Наперадзе іх чакаюць няпростыя будні, — заўважыў Віктар Хрэнін. — Хлопцам прыйдзецца асвоіць праграму баявой падрыхтоўкі, вывучыць сучасныя ўзбраенне і тэхніку, атрымаць ваенна-ўліковую спецыяльнасць. Падчас нясення службы яны возьмуць удзел ва ўсіх мерапрыемствах аператыўна-баявой падрыхтоўкі, якія пройдуць у наступным навучальным годзе». Адным з такім мерапрыемстваў, у прыватнасці, станугь сумесныя вучэнні з Расійскай Федэрацыяй «Шчыт Саюза — 2023».

Міністр абароны акцэнтаваў увагу, што ва Узброеных Сілах Беларусі ўважліва вывучаюць і аналізуюць вопыт сучасных узброеных канфліктаў і ўключаюць яго ў працэс баявой падрыхтоўкі. «Мы вучым таму, што неабходна, — удакладніў ён. — Перакананы, што сённяшнія маладыя людзі не толькі стануць сапраўднымі прафесіяналамі, мужчынамі і абаронцамі Радзімы, але і набудуць падчас службы сапраўдных, верных сяброў».

**Вераніка КАНЮТА.**

Праверана на сабе. Жаночы погляд

# Дом для будучых афіцэраў

## Карэспандэнт паспрабавала сябе ў ролі ваеннага курсанта

**Ваенная акадэмія — галоўная кузня армейскіх кадраў. Гэта 11 факультэтаў, 39 кафедраў, 35 спецыяльнасцяў, тысячы прафесійна падрыхтаваных афіцэраў. Лічбы ўражваюць. Але абітурыенту цікава іншае: што схавана за фасадам будынка, як пражываюць свой дзень курсанты, як выглядае іх дом на чатыры гады. Карэспандэнту ўдалося прыадкрыць заслону жыцця будучых афіцэраў і хоць часова, але пабыць курсантам Ваеннай акадэміі.**



Каб цалкам пагрузіцца ў курсанцкія будні, я вырашыла не проста правесці дзень за партай у акадэміі, а ад світання да змяркання з курсантамі факультэта сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання пражыць маленькае жыццё.

### ПАЎГАДЗІНЫ НА ЗБОРЫ

Кожная раніца будучых афіцэраў пачынаецца з зарадкі. Пасля пад'ёму ёсць усяго некалькі хвілін, каб прачнуцца, хутка апрануцца і выйсці на пастраенне. Відовішча зачароўвае: з усіх бакоў сыходзяцца людзі. У прыцемках ліхтара можна разглядзець толькі сонныя сілуэты. Але літаральна праз дзесяць хвілін на тварах курсантаў ужо і ўсмешка, і чырвань. І ўсё роўна — на вуліцы плюс або мінус 20 — заняткі заўсёды пачынаюцца ў адзін і той жа час.

Праз сорак хвілін мы вяртаемся ў інтэрнат: прыняць душ, навесці парадак у пакоі — на ўсё гэта паўгадзіны. Праўда, дзяўчатам трэба крыху больш часу: прыгажосць, нават у сценах ваеннай ВНУ, ніхто не адмяняў. Дарэчы, першае, што павінен зрабіць курсант Ваеннай акадэміі, пераступіўшы парог навучальнай установы, — здаць мабільны тэлефон. Выкарыстоўваць мабільнік прыстасаванні можна толькі ў вольны час, а гэта або вечар, або выхадныя.

Перад тым як пайсці на сняданак — зноў пастраенне. Старшы афіцэр дасканала правярае вонкавы выгляд. На заметку будучым курсантам: калі вы не прызвычаіліся снедаць, то пасля фізкультуры і ранішніх працэдур вы будзеце абганяць усіх па дарозе да сталовай — абы хутчэй пакласці ў рот запаветную лыжку цёплай кашы. У ранішнім меню — аўсяная каша, варанае яйка, салодкі чай, батон і кавалачак сметанковага масла. Гэта вельмі смачна. Наступны прыём ежы — бліжэй да гадзіны дня, таму ў талерках нічога не застаецца.

### НАВУЧАННЕ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

На тэрыторыі акадэміі — дзясяткі будынкаў і пабудоў. У бясконцых калідорах аднаго толькі галоўнага корпуса можна заблукаць. Белыя калоны, на сценах — партрэты легендарных военачальнікаў. Той, хто пераступае парог КПП, усведамляе: тут рыхтуюць ваенную эліту, людзей, здольных абараніць сваю краіну.

Сучасны профіль навучання ў Ваеннай акадэміі ўлічвае прыярытэтныя напрамкі ваеннай справы: супрацьпаветраную абарону, авіяцыю, сілы спецыяльных аперацый, сувязь і аўтаматызаваныя сістэмы кіравання. Дарэчы, менавіта па апошняй спецыяльнасці я і буду праходзіць навучанне. Пасля першых двух заняткаў становіцца зразумела, наколькі няпроста гуманітарыю асвойваць гэтую спецыяльнасць. Любы кірунак патрабуе інтэлектуальнай падрыхтоўкі.

Працэс навучання ў акадэміі ўражвае. Дух захоплівае толькі ад таго, як тут вітаюць выкладчыка. Сучасныя навучальныя класы, дзе замест партаў — навінкі ўзбраення. Унікальны падыход да навучання: курсант імгненна асвойвае не толькі тэорыю, але і практыку. Каб азнаёміцца з узорамі тэхнікі для сувязі, не трэба выязджаць на палігон — яны ўстаноўлены адразу ж у аўдыторыях. Тут размешчаны і сапраўдныя радыёрэлейныя станцыі. Стаяць і апаратныя, з якіх курсанты факультэта сувязі вядуць кіраванне самімі станцыямі: атрымліваюць розныя каардынаты, наладжваюць кантакт з атрымальнікам. Чым жа яны адрозніваюцца ад тых, што знаходзяцца на палях? Толькі тым, што гэта стацыянарныя станцыі, а там — мабільныя. Да сярэдзіны дня ўдалося авалодаць тэрміналогіяй сувязістаў, і я ўжо лёгка тлумачыла апаратарам, чым адрозніваюцца радыёрэлейныя станцыі ад трапасферных.

### НАСЫЧАНЫ ДЗЯНЁК!

Дзень настолькі насычаны, што першы час без нататак не абысціся — усё трэба запісваць. Пара, яшчэ пара, практыка ў вайсковай часці. Што там далей? Агнявая, страявая, марш-кідок. Потым усё? Як не? Яшчэ пары?

Я паспяваю наведаць заняткі па агнявой падрыхтоўцы і асвяжыць навыкі стральбы з пісталета Макарава. Пасля мы скідваем бронекамізэлькі і ляцім на пляц. Затым экіпіруемся і выходзім на старт. Наперадзе — марш-кідок на пяць кіламетраў. Для курсантаў гэта не мяжа: бегаюць яны і па 10, і па 30 кіламетраў. Я ўжо стамілася, а яшчэ толькі абед. Пасля невялікага перапынку пераапранаемся — і зноў на факультэт. Наперадзе яшчэ тры пары.

Завяршаецца дзень вячэрняй паверкай. Для курсантаў гэта штодзённасць, для мяне — цэлая падзея. Увесь факультэт строіцца на пляцы акадэміі. Курсавыя называюць прозвішчы: трэба пераканацца, ці ўсе на месцы.

Некаторым курсантам яшчэ няма і дваццаці гадоў, але яны ўжо добра разумеюць, што такое вернасць і абавязак. Многія з іх дагэтуль і цяжкасцяў не ведалі, а тут з годнасцю пераносяць усе нягоды і пазбаўленні. Усе з іх упэўнены ў сваім выбары — стаць курсантамі галоўнай ваеннай ВНУ краіны. А значыць, беларускімі афіцэрамі і прафесіяналамі ваеннай справы.

**Ганна ЧЫЖ-ЛІТАШ.**
**Фота з архіва аўтара.**

Боегатоўнасць

# АГНЯВЫ ГАРАНТ БЯСПЕКІ

## Якія ваенныя спецыялісты дыктуюць правілы на полі бою і чаму вучаць узброеныя канфлікты сучаснасці?

**Днямі вайскоўцы адзначылі прафесійнае свята — Дзень ракетных войск і артылерыі. І калі артылерыя ўжо больш як 600 гадоў з'яўляецца надзейным шчытом любой арміі, то ракетныя войскі, здольныя наносіць удар разбуральнай сілы, вядуць сваё летазлічэнне з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Без гэтага віду ўзбраення ўжо немагчыма ўявіць сучасную армію, якая клапоціцца аб суверэнітэце і тэрытарыяльнай цэласнасці. Сёння ракетныя войскі і артылерыя — неад'емная частка Узброеных Сіл Беларусі, адзін з асноўных гарантаў нацыянальнай бяспекі.**

У чым перавага ракетнага і артылерыйскага ўзбраення як сродку баявога паражэння, якімі кампетэнцыямі павінны валодаць спецыялісты, што кіруюць высокадакладнай зброяй, і як адбываецца працэс навучання будучых ракетчыкаў і артылерыстаў — аб гэтым мы пагаварылі з **начальнікам факультэта ракетных войск і артылерыі і ракетна-артылерыйскага ўзбраення Ваеннай акадэміі палкоўнікам Вадзімам РАБАКОНЕМ**.

***— Вадзім Віктаравіч, артылерыю называюць богам вайны. Наколькі гэта красамоўнае параўнанне актуальнае сёння, у сувязі з ваеннымі канфліктамі сучаснасці?***

— Роля артылерыі на сучасным этапе вельмі вялікая. Гэта дэманструе і спецыяльная ваенная аперацыя, якую праводзіць Расія, прыбіраючы пагрозу нацызму на Украіне. Мы бачым, што ракетныя войскі і артылерыя выконваюць да 70 % задач па агнявым паражэнні праціўніка, якія стаяць перад войскамі.

***— Атрымліваецца, прафесія артылерыста як ніколі запатрабаваная?***

— Запатрабавана ўвогуле прафесія афіцэра. Мы бачым, што ваеннаслужачаму па-ранейшаму ўласцівыя такія якасці, як абавязак, гонар, беззапаветнае служэнне сваёй Айчыне, здольнасць да самаахвяравання. І няважна, артылерыст ён, разведчык або інжынер. Прафесія афіцэра недзялімая. У арміі патрэбныя ўсе спецыялісты. І артылерысты — не выключэнне. Запатрабаванасць прафесіі дыктуюць рэаліі нашага жыцця. Аналіз ваенных канфліктаў мінулых гадоў паказвае, што ўсюды выкарыстоўвалася артылерыя. Тую ж спецыяльную ваенную аперацыю ва Украіне называюць вайной артылерыі: вялікая колькасць артылерыйскіх сістэм прымяняецца як з аднаго боку, так і з другога.

***— Якія перавагі ў артылерыі на полі бою?***

— Перш за ўсё гэта хуткасць і далёкасць агнявога паражэння. Натуральна, гэта і дакладнасць. Высокадакладная зброя ў сучасных ваенных канфліктах вельмі запатрабаваная, і для таго, каб звесці да мінімуму страты грамадзянскага насельніцтва, максімальна прымяняюць артылерыю. Гэта можна назіраць і на прыкладзе спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне.



Начальнік факультэта ракетных войск і артылерыі і ракетна-артылерыйскага ўзбраення Ваеннай акадэміі палкоўнік Вадзім РАБАКОНЬ.

***— Ракетныя войскі заўсёды з'яўляліся стрымліваючым фактарам для праціўніка. Сёння іх функцыя па стрымліванні магчымай узброенай агрэсіі як ніколі навідавоку. Чаму, на ваш погляд, любая сучасная армія павінна валодаць гэтай зброяй?***

— Функцыю стрымлівання выконваюць стратэгічныя ракеты ядзернага паражэння. У нас ядзернай зброі няма. Аднак у нас ёсць сістэмы, якія валодаюць значнымі характарыстыкамі і могуць выконваць задачы на істотнай адлегласці. На далёкасці 300 кіламетраў ажыццяўляе пускі рэактыўная сістэма залпавага агню «Паланэз», на далёкасці 120 кіламетраў — «Точка-У». Безумоўна, гэта стрымліваючы фактар. У выпадку нападзення на нашу тэрыторыю мы не будзем сядзець, а выкарыстаем усе віды ўзбраення для таго, каб гэты канфлікт скончыць. Не кожная армія можа сабе дазволіць мець такую зброю.

***— Адпаведна, валодаць такімі высокадакладнымі ўстаноўкамі і сістэмамі можа і не кожны ваеннаслужачы. Гэтых вузкіх спецыялістаў рыхтуе менавіта ваш факультэт. Ці кожны курсант здольны асвоіць суперсучасную тэхніку?***

— Падчас паступлення на факультэт ракетных войск і артылерыі і ракетна-артылерыйскага ўзбраення маладыя людзі здаюць цэнтралізаванае тэсціраванне па адной з дзяржаўных моў, па матэматыцы і фізіцы. Улічваецца і сярэдні бал атэстата. Акрамя таго, нашы курсанты праходзяць прафесійны адбор, які выяўляе пэўныя схільнасці маладога чалавека да таго ці іншага віду дзейнасці. Каб паглядзець, на што яшчэ здольны абітурыент, праводзім і фізічныя выпрабаванні. Кожны малады чалавек здольны асвоіць нашы спецыяльнасці, якіх дзве: «Кіраванне падраздзяленнямі ракетных войск і артылерыі», а таксама «Эксплуатацыя радыётэхнічных сістэм (артылерыі)». Адбываецца навучанне і па спецыяльнасці «Эксплуатацыя наземных сістэм узбраення». Такім чынам, акрамя таго, што мы рыхтуем спецыялістаў, якія непасрэдна прымяняюць гэтую зброю, ажыццяўляем і навучанне будучых афіцэраў, якія арганізоўваюць рамонт не толькі нашага, а і ўсяго ўзбраення беларускай арміі. У цэлым артылерысту, каб асвоіць суперсучасную тэхніку, неабходна валодаць матэматычным складам розуму, умець хутка прымаць рашэнні. Ракетнага ўзбраення становіцца ўсё больш. Курсант не ў стане будзе вывучыць і артылерыйскія, і ракетныя ўзоры зброі. Таму мэтазгодна, што ў наступным годзе адна спецыяльнасць — «Кіраванне падраздзяленнямі ракетных войск і артылерыі» — будзе мець дзве прафілізацыі. Адны будуць вывучаць ракетную тэматыку, другія — артылерыю. На агульных прадметах курсанты будуць навучацца разам. Увогуле, артылерыя — калектыўная зброя. Калі



Фота «Ваяр».

адзін замарудзіўся або памыліўся, то, натуральна, снарад паляціць не туды. Ёсць такое паняцце, як узаемазамяняльнасць. Курсантаў навучаюць так, каб у выпадку выпадзення кагосьці з разліку, за вылічэннем механіка-кіроўцы, яго маглі замяніць.

***— Каб авалодаць любой прафесіяй, неабходна практыка. Наколькі навучанне на факультэце практыкаарыентаванае?***

— Першая наша спецыяльнасць — камандная. Яна больш як на 70 % нясе практычную скіраванасць. Безумоўна, навучанне на факультэце пачынаецца з тэарэтычных заняткаў. У выніку лекцыйныя заняткі пераходзяць у практычную частку. У нас ёсць свае імітацыйныя сродкі, якія замяняюць рэальную стральбу боепрыпасамі. Двойчы на год мы выязджаем трэніравацца на Асіповіцкі палігон 51-й артылерыйскай брыгады, дзе з рэальных гармат, мінамётаў выконваем баявыя задачы. Аднак перш чым выехаць на вялікія палігоны і прадэманстраваць свае ўменні на сапраўдным узбраенні, курсанты трэніруюцца на імітацыйных сродках на малых артылерыйскіх палігонах. Для курсантаў, якія асвойваюць камандную спецыяльнасць, усе практыкі і стажыроўкі праводзяцца ў войсках. Практычна чатыры месяцы з дзесяці яны знаходзяцца ў баявых падраздзяленнях. Курсанты, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Эксплуатацыя радыётэхнічных сістэм артылерыі», практычным заняткам удзяляюць каля 60 % навучальнага часу.

***— Наша армія не стаіць на месцы. У тым ліку развіваюцца ракетныя войскі і артылерыя. Наколькі хутка ў навучальны працэс укараняюцца кампетэнцыі, запатрабаваныя ў войсках?***

— У нагу з часам мы ідзём і робім гэта вельмі дынамічна. Дапусцім, прыняты на ўзбраенне мінамёт 2Б24. Яго толькі прынялі, а мы ўжо афармілі заяўку для таго, каб яго атрымаць і пачынаць навучанне. Не даюць стаяць на месцы і ваенныя канфлікты сучаснасці. Баявыя дзеянні ў Сірыі, спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне — ёсць цікавыя тэндэнцыі з тактычнага пункту гледжання, з пункту гледжання кіравання агнём. У прыватнасці, спецыяльная ваенная аперацыя паказвае, што ў сучасных баявых дзеяннях вельмі запатрабаваныя беспілотныя лятальныя апараты: яны валодаюць той інфармацыяй, якая неабходная для нанясення паражэння праціўніку. Нашы выкладчыкі ўжо прайшлі навучанне на беспілотных лятальных апаратах верталётнага тыпу і ўжо выконвалі задачы па выкарыстанні квадракоптараў як сродку для засечкі цэлі,назірання вынікаў агнявога паражэння і карэкціроўкі агню. Спецыяльная ваенная аперацыя ўнесла пэўныя карэктывы ў навучанне артылерыстаў і ракетчыкаў. Усе сучасныя тэндэнцыі вядзення бою ўкараняюцца ў навучальную праграму.

***— А як ідзе асваенне курсантамі «жамчужыны» айчыннага ваенпрама — рэактыўнай сістэмы залпавага агню «Паланэз»?***

— Вывучаюць тэорыю тут, у сценах Ваеннай акадэміі, а на практычныя заняткі выязджаюць туды, дзе стаяць сістэмы залпавага агню. Гэта не проста разавы занятак, а двухтрохтыднёвае навучанне. Асвойваючы «Паланэз», там жа яны вывучаюць і рэактыўную сістэму залпавага агню «Смерч», і тактычны ракетны комплекс «Точка-У», хоць гэтыя віды ўзбраення знаходзяцца і ў нас. Аднак абмен вопытам дзеючых афіцэраў з выкладчыкамі акадэміі нішто не заменіць. Навучанне ідзе ў тых воінскіх часцях, дзе стаяць на ўзбраенні нашы сістэмы.

***— Ці здольныя іх засвоіць дзяўчаты?***

— Дзвюх дзяўчат мы ўпершыню набралі на факультэт сёлета. Праўда, на спецыяльнасць, звязаную з эксплуатацыяй наземных сістэм узбраення. Дагэтуль дзяўчаты ў нас не навучаліся. Спецыфіка нашай прафесіі — артылерыста або ракетчыка — не прадугледжвае жаночай рукі. Калі жанчына-сувязістка — гэта больш прывычна, то артылерыстка або ракетчыца — ужо незвычайна. Можа быць, мы памыляемся.

***— Магчымасці артылерыі і ракетных войск красамоўна адказваюць на меркаванні некаторых заходніх і заакіянскіх экспертаў, якія любяць разважаць на тэму, ці будзе трэцяя сусветная вайна...***

— Напружанасць, якая цяпер прысутнічае ў свеце, магчыма, нават больш сур'ёзная, чым у часы халоднай вайны. Усе добра разумеюць: тое, што адбываецца на тэрыторыі нашай паўднёвай суседкі, — гэта, па сутнасці, вайна супраць Расіі не проста Украіны, а вайна блоку НАТА. Іх выказванне — выяваць да апошняга ўкраінца — абсалютна праўдападобнае. Аднак, націснуўшы кнопку ядзернай зброі ў адной краіне, адбудзецца неадкладны адказ з іншага боку. І гэта будзе крах нашай цывілізацыі. Хочацца спадзявацца, што розум пераважыць і трэцяй сусветнай вайны не будзе.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Бобруйский кожевенный комбинат» (Продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве /директора ООО «Диспонент» Будкова Д.В. извещает о проведении 5 декабря 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Местонахождение лотов:** г. Бобруйск, ул. Минская, 142А. **Условие продажи:** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. | | | | |
| 1 | **Котел для варки клея 5К-1**, инв. № 20-004 | 1 440,00 | 72,00 | **144,00** |
| 2 | **Котел для варки клея 5К-1**, инв. № 20-005 | 1 440,00 | 72,00 | **144,00** |
| 3 | **Котел для варки клея 5К-1**, инв. № 20-008 | 1 440,00 | 72,00 | **144,00** |
| 7 | **Котел для варки клея КК-3.8**, инв. № 20-059 | 1 260,00 | 63,00 | **126,00** |
| 10 | **Машина строгальная 07578**, инв. № 05-078 | 21 780,00 | 1 089,00 | **2 178,00** |
| 11 | **Станок лощильно-растяжной «Ликсфлора»**, инв. № 03-205 | 3 300,00 | 165,00 | **330,00** |
| 13 | **Автоматический укладчик кож 07588**, инв. № 06-257 | 4 680,00 | 234,00 | **468,00** |
| 17 | **Сушилка вакуумная «Оверлай ТМ/3»**, инв. № 03-083 | 4 260,00 | 213,00 | **426,00** |
| 18 | **Сушилка вакуумная «Оверлай ТМ/3»**, инв. № 03-237 | 35 940,00 | 1 797,00 | **3 594,00** |
| 19 | **Укладчик кож 2400 мм**, инв. № 205-118 | 21 960,00 | 1 098,00 | **2 196,00** |

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Бобруйский кожевенный комбинат» (Продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве /директора ООО «Диспонент» Будкова Д.В. извещает о проведении 5 декабря 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (в количестве 82 объектов оборудования) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы», www.bankrot.gov.by.**
**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 03.06.2022 г. № 107 (29729)**

**Продавец: ОАО «Бобруйский кожевенный комбинат»,** 213822, г. Бобруйск, ул. Минская, 142А.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: 8 (0225) 72-46-95** Болтушкин Сергей Евгеньевич – юрисконсульт (правовая информация, предварительная запись на осмотр имущества).

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225, к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 22 ноября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 1 декабря 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов, возместить все затраты, связанные с организацией и проведением торгов, затраты на публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 19.01.2022 г. № 11 (29633).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by или www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

---

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 22.12.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок: 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **ЛОТ № 1: легковой автомобиль седан PEUGEOT 406, 1998 года выпуска, объем 2.0, дизель, серебристый металлик, регистрационный номер 5765 МХ-4, номер кузова (рамы) VF38BRHZE80665680, пробег 438 000** |
| **Начальная цена продажи** | 3 798,00 руб. (три тысячи семьсот девяносто восемь рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 379,00 руб. (триста семьдесят девять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 20 декабря 2022 г. до 15.00** |
| Условия проведения аукциона: оплату за приобретаемый объект производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь; расходы по заключению договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты; документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ОАО «Телеханский завод столярных изделий» (УНП 200099487), объявляет о проведении **06.12.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/11/spisok-imushhestva-telehanskij-zsi.pdf**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 (29) 254-53-88.

Продавец: ОАО «Телеханский завод столярных изделий»;

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, комн. 501; +375296083100; **contact@bankrottorg.by.**

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **05.12.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **22.11.22** по 17.00 **05.12.22** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили (пропорционально по каждому лоту): за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ – 890,84 бел. руб., за публикацию в СМИ – 2415,67 бел. руб. с НДС, стоимость размещения объявления в Журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» согласно счет-фактуре, стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, за оценку по лотам №№ 1–18 – 697,39 бел. руб. с НДС, за оценку по лоту № 19 – 637,32 бел. руб. с НДС, за оценку по лоту № 20 – 532,84 бел. руб. с НДС; аукционный сбор: по лотам №№ 1–18 – 7 % от цены реализации имущества, по лотам №№ 19, 20 – 5 % от цены реализации имущества.

Дополнительные условия: по лотам №№ 19, 20 – ипотека.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения электронных торгов.

---

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества**

## ООО «БелАгроГарант»

(УНП 691902856, Минская область, Минский район, с/с Боровлянский, д. Боровляны, ул. 40 лет Победы, д. 23А, комн. 74-6),

**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 22 декабря 2022 года.**

Начало – 14.00. Заявки принимаются с 22 ноября 2022 года по 21 декабря 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «БелАгроГарант» (УНП 691902856)** в лице антикризисного управляющего – индивидуального предпринимателя Витковской Натальи Александровны, тел. 8 (029) 689-32-39.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 10 %.

Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайтах: http://bankrot.gov.by/» и http://www.specrealization.by/.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

---

02.12.2022 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Полесьежилстрой».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Полесьежилстрой»: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Кижеватова, 60.

Время регистрации в день проведения собрания – с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Дата сбора реестра акционеров – 22.11.2022 г.

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 22.11.2022 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200050191

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества Общественного объединения «ПОЛЬСКА МАТЕЖ ШКОЛЬНА» (УНП 500446160), объявляет о проведении **05.12.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

---

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества Общественного объединения «ПОЛЬСКА МАТЕЖ ШКОЛЬНА» (УНП 500446160), объявляет о проведении **22.12.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

---

## ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЯВЛЕННЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ И ПРЕДМЕТЕ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов – комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета. Продавец – Белорусский государственный университет**

**Оператор электронной торговой площадки – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа», Электронный адрес электронной торговой площадки – https://et.butb.вуф**

| Дата электронных торгов | Сведения о предмете электронных торгов | Местонахождение имущества | Начальная цена, руб. | Информация о публикации извещения |
|---|---|---|---|---|
| **07.12.2022** | Здание специализированное коммунального хозяйства (насосная станция 1 подъема), 193,9 кв. м, с хозяйственно-бытовой канализационной сетью. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0634 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах электронных торгов либо признании электронных торгов несостоявшимися | г. Минск, ул. Макаенка, 19Б | 25 391,33 | Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах: **https://au.nca.by/item/2057310** и **https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/** |

УНП 100048181

# ЭЛІКСІР ЗДАРОЎЯ

## Сухафрукты: ведаць цэны і не памыліцца з якасцю



**Каб умацаваць імунітэт, падтрымаць сэрца і аздаравіць кішэчнік, дыетолагі раяць восенню і зімой замяняць салодкія дэсерты сухафруктамі. Улетку карысных «заменнікаў цукру» на нашым стале хапае. А ў лістападзе на рынках з'яўляюцца разынкі, курага, чарнасліў, фінікі і інжыр новага ўраджаю. Высветлім, пачым іх прапануюць пакупніку гэтай восенню.**

Так склалася гістарычна: у нашых шыротах рацыён мае яскравую сезоннасць. Напрыклад, пра сухафрукты сярэднестатыстычны спажывец успамінае бліжэй да халадоў. Менавіта цяпер клапатлівыя бабулі пачынаюць круціць на мясарубках для ўнукаў вітамінную сумесь — напэўна, многія з дзяцінства памятаюць яе склад: чарнасліў, курага, разынкі, грэцкія арэхі і мёд. Магчымыя варыянты — часам дадаюць інжыр, часам фінікі, часам фундук. Неапетытную з выгляду, але духмяную і смачную масу раскладваюць у некалькі паўлітровых слоікаў і перадаюць дзецям з наказам: «Не забудзьцеся, па адной чайнай лыжцы раніцай нашча, а запіваць — цёплай кіпячонай вадой». Рэцэпт праверany, упершыню ўвайшоў у моду ў 1980-х. І, дарэчы, атрымаў адабрэнне сучасных нутрыцыёлагаў. Справа ў тым, што, напэўна, няма такога прадукту, які мог бы параўнацца з сухафруктамі па колькасці ўтрымання мінеральных рэчываў і мікраэлементаў: калію, магнію, фосфару, марганцу, жалеза, медзі, серы, хлору, цынку, натрыю, нікелю, малібдэну, кобальту, ёду і селену. Плюс да гэтага яны — найбагацейшая крыніца вітамінаў. З 10 кг садавіны атрымліваецца ўсяго каля 2 кг сухафруктаў, гэта значыць, у іх у 5 разоў больш арганічных кіслот, вітамінаў і мінеральных рэчываў, чым у такой жа колькасці свежай садавіны. Гэтым і абумоўлены выдатныя карысныя ўласцівасці: пазбаўляючыся вады, але не губляючы пажыўнай каштоўнасці, сухафрукты ператвараюцца ў магутны канцэнтрат вітамінаў і мікраэлементаў.

### СЯБРОЎКА ГІПЕРТОНІКАЎ

Усё вышэйсказанае ў поўнай меры можна аднесці да курагі, галоўных сухафруктаў сардэчнікаў. Курагу — сушаныя абрыкосы без костачкі — прыдумалі старажытныя кітайцы. На Каўказе і ў Сярэдняй Азіі, дзе абрыкосавыя дрэвы вырошчваюцца ў гарадскіх садах і на прысядзібных участках, як у нас яблыні, сушаныя плады гэтага дрэва дзеляць на розныя віды, і курага — толькі адзін з іх. Сушаны цалкам абрыкос з костачкай называецца ўрук. Курага — гэта высушаныя палавінкі абрыкосу без костачкі. А тое, што мы прывыклі называць курагой — высушаны цалкам абрыкос без костачкі, — гэта кайса.

— Дык вось, самы карысны — гэта ўрук, — распавядае прадавец Тэнгіз.

Ён кажа, што ў яго на радзіме абрыкосы сушаць непасрэдна на дрэвах, пакідаючы плады на галінцы да поўнай страты вады.

Але, у прынцыпе, пры любым спосабе сушкі менавіта ўрук вызначаецца высокім утрыманнем калію, неабходнага для здароўя нерваў, рэгуляцыі крывянога ціску і падтрымання аптымальнай работы сардэчна-сасудзістай сістэмы. Сёння кардыёлагі салідарныя са старажытнымі медыкамі: урук сапраўды ліквідуе закупорванне сасудаў і размягчае пухліны. Такія ж гаючыя ўласцівасці, хоць і ў некалькі меншай ступені, медыкі прызнаюць за курагой і кайсой. Салодкія гатункі сухафруктаў з абрыкосу традыцыйна прапісваюць пры нервовых захворваннях, кіслыя — пры прастудах і мігрэні. Але ў нечым курага і кайса пераўзыходзяць урук. Сушаныя абрыкосы без костачкі ўтрымліваюць значна больш ёду, цукраў і каратыну. Рэгулярнае ўжыванне ў ежу курагі — добрая прафілактыка эндакрынных захворванняў. Любыя сухафрукты з абрыкосаў — з костачкай і без — умацоўваюць сардэчную мышцу і падтрымаюць зрок пры ўзроставых зменах сятчаткі (сухафрукт утрымлівае калій, карацін, арганічныя кіслоты, жалеза, фосфар, кальцый, вітаміны С і $B_5$).

Да ведама тых, хто худзее: курага каларыйная. У 100 г — 190 ккал. Каб скінуць вагу, а не патаўсцець на ёй, за дзень трэба з'ядаць не больш 5-10 штук. У Беларусь курага прыехала з гэтым сезоне ў асноўным з Таджыкістана і Турцыі. Таджыкская з кіслінкай на Камароўцы каштуе 19 рублёў за кілаграм, салодкая — 23, турэцкая «шакаладнага» сорту — 40 рублёў за кілаграм. Урук (таксама з Таджыкістана) абыйдзецца гэтай восенню ад 18 да 30 рублёў за кілаграм.

### ЖАЛЕЗНЫЯ НЕРВЫ, ЗДАРОВЫЯ НЫРКІ

Чарнасліў, высушаны плод аднайменных сартоў слівы, здаецца, самыя народныя сухафрукты нашых шырот.

— Больш за ўсё бяруць чарнасліў, потым ідуць па запатрабаванасці разынкі і курага, — распавядае прадавец Святлана.

Яна кажа, што лепшыя для высушвання — слівы сорту «венгерка» (яны салодкія і са шчыльнай мякаццю, таму сушыць іх нескладана, і чарнасліў без усялякіх хітрыкаў атрымліваецца выдатным). Зараз на Камароўцы можна знайсці чарнасліў з Паўночнага Каўказа, Малдовы і з паўднёвых абласцей Расіі.

Калорый у чарнасліве нават больш, чым у кураге (231 ккал на 100 г), але і карысных уласцівасцяў не менш. Прадукт багаты на вітаміны (Е, бета-карацін, РР, С, групы В), змяшчае жалеза, калій, кальцый, натрый, магній, фосфар, кобальт, ёд, цынк, фтор, марганец, медзь. Дзякуючы поліфенолам павышае пругкасць сасудзістай сценкі (прывітанне, гіпертонікі!), аднаўляе паніжаную працаздольнасць (асабліва актуальна для знясіленых гіпадынаміяй прадстаўнікоў «сядзячай работы») і паляпшае агульны стан арганізма (на заметку аслабленым маркотнай гарадской восенню). Таксама, чарнасліў — верны саюзнік дзяўчат: паляпшае стан скуры пры вуграх. Карысныя сухафрукты пры мочакаменнай хваробе і падтрымліваюць рН-баланс у арганізме.

Чарнасліў, як і курага, бывае з костачкай і без яе. З костачкай — больш карысны. І танны, дарэчы. Малдаўскі з костачкай — у сярэднім 10–13 рублёў за кіло, без яе — 15–17.

— Лепш вазьміце з костачкай, — раіць Святлана. — Калі яе дастаюць, у плод могуць трапіць шкодныя бактэрыі. Я заўсёды раю пакупнікам менавіта з костачкай, асабліва калі бяруць для дзяцей. Костачку дастанеце самі. А калі бераце без яе, абавязкова старанна мыйце пад праточнай вадой адтуліну ў плодзе, праз якую костачку даставалі.

### АД БЯССОНІЦЫ І ГРЫПУ

Разынкі бываюць чатырох асноўных відаў: светлакарычневыя (са светлага вінаграду сорту «кішміш», самыя маленькія і без костачак), чорныя (з цёмнага вінаграду без костачак), жоўтыя (з белага вінаграду з адной костачкай) і буйныя цёмна-карычневыя (з чырвонага вінаграду).

— На выпечку больш падыходзяць цёмныя салодкія разынкі, — праводзіць «лікбез» прадавец Кацярына. — Белы не такі салодкі, яго часцей бяруць проста паесці або для здароўя.

Усе чатыры разнавіднасці зараз прапанаваныя на харчовых рынках даволі шырока. Каштуюць яны па-рознаму. Ад 24 рублёў за кілаграм (светлыя разынкі, без костачак, «джамба», прыехалі з Чылі) да 11–12.50 («голд», Малдова). Узбекскія цёмныя разынкі з вінаграду сорту «кішміш» — 17–25 рублёў за кіло.

Аб карысці разынак для здароўя разважаць можна доўга, так што абмяжуемся асноўнымі плюсамі. Сухафрукты здымаюць апухласць і зніжаюць раздражняльнасць, хутка аднаўляюць сілы і лечаць ад анеміі, паляпшаюць стан зубоў і дзёсен і нармалізуюць работу сэрца. І, што асабліва актуальна, спрыяюць хуткаму лячэнню ад прастуды, грыпу (і нават ковіду, калі верыць прадаўцам) і ўмацоўваюць імунітэт. А акрамя гэтага, дапамагаюць справіцца з застарэлай бяссонніцай. Усе віды разынак утрымліваюць вітаміны групы В ($B_1$, $B_2$, $B_5$), Н і РР, беспрэцэдэнтна вялікую колькасць калію, а таксама кальцый, магній, жалеза, фосфар і натрый.

### НІЧОГА, АКРАМЯ КАРЫСЦІ

Мы, ураджэнцы паўночных шырот, не ўмеем выбіраць сухафрукты. Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў наш час нялёгка знайсці прадукт, высушаны па ўсіх правілах. Сучасныя тэхналогіі сушкі прадугледжваюць прымяненне хімікатаў, што значна зніжае карысць, а часам можа зрабіць сухафрукты і зусім не карыснымі для здароўя. Напрыклад, для надання куразе інтэнсіўнай аранжавай афарбоўкі, а таксама каб не дапусціць гніення падчас доўгага захоўвання, выкарыстоўваецца сярністы ангідрыд ($SO_2$). У сучасным працэсе вытворчасці курагі могуць удзельнічаць таксама фарбавальнікі. Сліва і вінаград маюць тоўстую скурку, і каб паскорыць сушку, іх могуць апрацаваць каўстычнай содай (Е524) — гэтае сінтэтычнае рэчыва таксама выкарыстоўваюць у бытавой хіміі. Каб сухафрукты не зліпаліся паміж сабой, іх апрацоўваюць раслінным тлушчам, і наколькі ён якасны, застаецца на сумленні вытворцы.

На самай справе, сапраўды якасны і карысны прадукт моцна прайграе ў прыгажосці сухафруктам, выробленым з ужываннем вышэйназваных рэчываў. Калі абрыкосы сушацца ў натуральных умовах, яны, губляючы вільгаць, набываюць цёмна-карычневы колер. Курага, якая прынясе карысць арганізму, не павінна быць празрыстай. Дастаткова пругкая навобмацак, яна мае матавае або нават шараватае адценне. Калі вы не ўпэўненыя ў якасці набытай курагі, лепш заліце яе кіпенем на паўгадзіны, потым добра вымыйце пад праточнай вадой і зноў высушыце, расклаўшы на папяровай сурвэтцы.

Высушаныя без прымянення хімікатаў разынкі таксама з матавым адценнем — яны не павінны мець бліскучую паверхню. У ідэале, калі разынкі «эка», на чаstцы ягад павінна прысутнічаць пладаножка. Разынкі не павінны быць празрыстымі — гэта паказвае на апрацоўку іх рознымі рэчывамі.

«Правільныя» чарнасліў — цёмна-сіняга колеру, цалкам сухі і досыць «нетаварнага выгляду» — зморшчаны і матавы, а не бліскучы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Надвор'е

# ЦЯПЕР, ЯК У КАНЦЫ СНЕЖНЯ

А на асобных участках рэк з'явіліся першыя ледзяныя ўтварэнні

**Нягледзячы на тое што на календары яшчэ толькі лістапад, надвор'е ўжо па-сапраўднаму зімовае. Сярэднясутачная тэмпература паветра ў выхадныя апускалася на 4—9 градусаў ніжэй за кліматычную норму і цяпер больш адпавядае канцу снежня. Акрамя таго, на большай частцы тэрыторыі ўжо ўсталявалася снежнае покрыва. Так, да раніцы панядзелка вышыня гурбаў па краіне вагаецца ад аднаго да 15 сантыметраў, месцамі па ўсходзе краіны — да 19 сантыметраў. І цяпер, на працягу гэтага тыдня, у нас чакаецца снег, часам з дажджом, а значыць — галалёдзіца, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Такім чынам, атмасферныя франты ад цыклону, які ссоўваецца з тэрыторыі Украіны на Бранскую вобласць Расіі, прынясуць чарговую «порцыю» ападкаў у нашу краіну. Пры гэтым тэмпература паветра крыху павысіцца. У аўторак чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Часам будзе ісці снег. Па ўсходзе краіны месцамі чакаюцца ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, будзе і галалёд. Максімальная тэмпература паветра днём ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла.

У сераду франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю нашай краіны. Фон атмасфернага ціску пачне расці, і ў большасці раёнаў істотных ападкаў не чакаецца, толькі ў начныя і ранішнія гадзіны пад уплывам няўстойлівых паветраных мас месцамі па паўночным усходзе краіны прагназуецца кароткачасовы снег. На асобных участках дарог будзе слізка. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 2—7 градусаў, а пры праясненнях — мінус 8—11 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 5 градусаў да плюс 1.

На наступны дзень, хоць і чакаецца дождж, ноччу істотна прымарозіць. Гэта ў чацвер адаб'ецца ўплыў чарговай франтальнай сістэмы, якая абумовіць ноччу месцамі, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 градуса па паўднёвым захадзе да мінус 9 градусаў па паўночным усходзе краіны, пры праясненнях — да мінус 12 градусаў. Днём тэмпература паветра — ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у канцы тыдня і на маючых адбыцца выхадных у Беларусі захаваецца няўстойлівы характар надвор'я. У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны чакаецца снег, мокры снег і дождж. У асобных раёнах будзе туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ноччу панізіцца да мінус 5 — плюс 2 градусаў. Днём будзе мінус 3 — плюс 3 градусы.

Спецыялісты адзначаюць змены на рэках. У сувязі з халодным надвор'ем адбывалася паніжэнне тэмпературы вады, і да канца мінулага тыдня на асобных участках рэк з'явіліся ледзяныя ўтварэнні. «Па стане на 21 лістапада ледзяныя ўтварэнні адзначаюцца на Заходняй Дзвіне каля гарадскога пасёлка Сураж, на большасці яе прытокаў, на Віліі — каля аграгарадка Міхалішкі, на Сожы — каля Крычава. На некаторых яго прытоках, а таксама на асобных прытоках Заходняга Буга, Дняпра і Прыпяці. На азёрах Нарач і Чырвонае назіраюцца забярэгі», — распавялі ў Белгідрамецэ.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Вогненныя вёскі. Нельга забыць

**Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца**

# ПОПЕЛ НАД ЛЁЗНЕНШЧЫНАЙ

## У невялікім раёне на ўсходзе Віцебскай вобласці вайна забрала кожнага другога жыхара

**У гады Вялікай Айчыннай вайны Лёзненскі раён Віцебскай вобласці панёс вялізныя страты: на яго тэрыторыі дзейнічалі канцлагер і гета, на Адаменскай горцы фашысты расстралялі звыш 1700 мірных жыхароў. Падчас ваенных дзеянняў тут навечна засталося каля 32 тысяч абаронцаў Айчыны, а вогненная хваля пракацілася па 196 населеных пунктах, пакінуўшы пасля сябе абгарэлыя коміны і сірот.**



Адзіныя ў Беларусі афіцэрскія могілкі ў аг. Стасева.

### ДЗЕВЯЦЬ МЕСЯЦАЎ ТУТ СТАЯЎ ФРОНТ

Напярэдадні вайны ў 1940 годзе ў Лёзненскім раёне налічвалася 78 калгасаў, тры саўгасы, дзейнічалі тры машынна-трактарныя станцыі, толькі ўвайшла ў строй ткацкая фабрыка, пачалі працаваць цэглавы і льнозаводы. Да ракавых 1940-х гадоў у раёне працавалі 48 школ, дашкольнае педвучылішча, чатыры бальніцы, Дом адпачынку і санаторый «Чэрніцы».

17 ліпеня 1941 года Лёзна было акупавана. У першае ваеннае лета ў лясах непадалёку ад вёсак Хацемля і Ардзежа пачалі ўзнікаць невялікія групы народных мсціўцаў, пасля яны аб'ядналіся ў першы партызанскі атрад пад камандаваннем Саладоўнікава. Напрыканцы восені 1941-га на мяжы Лёзненскага, Панізоўскага і Руднянскага раёнаў дзейнічалі каля 15 невялікіх атрадаў і мноства самастойных груп. Ужо з 25 красавіка 1942 года вядзе сваю баявую гісторыю партызанская брыгада «Алексея», якая была асноўным партызанскім фарміраваннем на тэрыторыі Лёзненшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У сярэдзіне ліпеня 1942-га ў склад брыгады ўваходзілі 1085 партызан, якія праводзілі дыверсіі і баявыя аперацыі на чыгуначных пуцях, грамілі варожыя гарнізоны, знішчалі тэхніку і жывую сілу праціўніка. У кастрычніку 1942 года ў раёне дзейнічалі 17 падпольных маладзёжных груп, па ініцыятыве падпольнага райкама камсамола ў лістападзе гэтага ж года ў «Алексеі» прайшла камсамольская канферэнцыя, якая знайшла водгук у іншых партызанскіх фарміраваннях Віцебшчыны.

Актыўная партызанская барацьба не магла не выклікаць узмацнення рэпрэсій акупантаў у адносінах да мірнага насельніцтва, асабліва з набліжэннем савецкіх войскаў да межаў раёна. Раніцай 8 кастрычніка 1943 года нашы байцы з поўначы Лёзна нанеслі нечаканы ўдар па праціўніку: немцы пакінулі тэхніку і ўзбраенне, імкнуліся бегчы, але трапілі пад агонь нашых стралкоў. Глыбока ўмацаваныя абаронныя пазіцыі гітлераўцаў былі зломленыя, аднак кровапралітныя баі за поўнае вызваленне горада працягваліся і 10 кастрычніка, які стаў днём вызвалення Лёзна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Менавіта тут узвіўся першы на Віцебшчыне чырвоны сцяг, як сімвал вызваленай ад нямецкага іга радзімы. Услед за райцэнтрам у выніку жорсткіх баёў вайскамі Чырвонай Арміі былі вызвалены яшчэ некаторыя населеныя пункты раёна, пасля чаго наступленне перайшло ў дзевяцімесячнае супрацьстаянне. Канчаткова Лёзненскі раён быў вызвалены ў ходзе Беларускай наступальнай аперацыі ў чэрвені 1944 года.

Якая цана была заплачана за вызваленне? За дзевяць месяцаў, што тут стаяў фронт, страты былі велізарнымі — на тэрыторыі раёна знайшлі свой апошні прытулак звыш 32 тысяч абаронцаў Айчыны. У аграгарадку Стасева знаходзяцца адзіныя ў Беларусі афіцэрскія могілкі, на якіх пахаваны 183 чалавекі: пехацінцы і танкісты, артылерысты і сувязныя, разведчыкі і сапёры, мінёры і медыкі, 55 капітанаў, 39 маёраў і 13 падпалкоўнікаў.

Кожны другі жыхар раёна не вярнуўся з фронту, быў спалены або закатаваны. На Лёзненшчыне 196 населеных пунктаў былі знішчаныя фашысцкімі захопнікамі, падчас карніцкіх распраў загінулі сотні жанчын, дзяцей і старых. Нават аднаўленыя пасля вайны вёскі назаўсёды засталіся ў чалавечай памяці пад жудасным найменнем «вогненныя».

### КОЛЬКІ ІХ, СЯСЦЁР ХАТЫНІ?

У вёсцы Зоры Гладанскага сельсавета ў вайну згарэлі ўсе 64 дамы, карнікі палілі вёску двойчы: у 1942 і 1943 гадах. За сувязь з партызанамі немцы расстралялі 22 жыхароў, ніхто з зарычан не вярнуўся з фронту. Захаваліся ўспаміны Марыі Дзмітрыеўны Стралковай: «Пасёлак быў вялікі, і жылі вельмі дружна, усе дапамагалі партызанам, гатавалі ім ежу, шылі кубанкі з чырвоным крыжам на версе, вязалі пальчаткі. Было і шмат бежанцаў, іх таксама прынялі як родных. Вясной 1942 года, калі на рацэ Каспле прарвалі фронт, у вёску прыйшлі салдаты. Усю нашу моладзь забралі ў войска, і ніхто з іх не вярнуўся. У снежні 1942 года ў вёску прыехалі карнікі, тады многія разам з партызанамі паспелі збегчы. А карнікі дзейнічалі ўсю ноч: закалолі свіней, разбурылі ўсе пчаліныя вуллі — шукалі мёд, пчол кінулі на снег. Для гэтых нелюдзяў не было нічога святога, тады яны спалілі 10 дамоў. Другі раз немцы наляцелі ў лютым 1943 года. Хто быў маладзейшы з нашых, той схаваўся ў лесе з партызанамі, беглі па глыбокім снезе па грудзі. Мая маці Дар'я Цімафееўна засталася ў хаце, наш сусед Раман Емяльянавіч Давальцоў таксама нікуды не пайшоў. Многія проста не паспелі збегчы. Калі карнікі сталі падпальваць хаты, мама ўпала на калені і стала прасіць, каб не знішчалі вёску. Немец ударыў маці прыкладам так, што яна ўпала і пакацілася па снезе. Вёску знішчылі; тых, хто не паспеў уцячы, сабралі і павезлі ў вёску Гаўрыкі, дзе размяшчаўся тады гэты карны атрад. Высадзілі з машыны і загналі ўсіх на ноч у хлеў. Адтуль маці з суседам і збеглі да нас, астатнія пабаяліся. Раніцай іх усіх выстраілі ў шарэнгу, яны апошні раз абняліся і заплакалі. Усіх расстралялі і пакідалі ў яму. Калі немцы сышлі, мы вярнуліся да таго страшнага месца, забралі ўсіх і пахавалі... Вёскі як і не было — адно папялішча засталося».

У Яськаўшчынскім сельсавеце да вайны налічвалася 15 населеных пунктаў, у апошнія месяцы перад вызваленнем раёна нашымі вайскамі немцы знішчылі амаль усе вёскі. Выключэнні склалі толькі тры населеныя пункты, у якіх засталося па некалькі дамоў. У Кавалёўскім сельсавеце за 1943 год былі ліквідаваныя амаль усе населеныя пункты — крок за крокам фашысты літаральна сціралі з твару зямлі іх адзін за адным.

З кастрычніка 1942 года падчас карнай аперацыі пад кодавай назвай «Хацемля — Аргуны» на тэрыторыі Крынкаўскага сельсавета немцы расстралялі звыш 150 чалавек і спалілі іх разам з хатамі. Перад



Успаміны Ігната Антонавіча Красельшчыкава 1870 года нараджэння, ураджэнца вёскі Слабада Лёзненскага раёна.

**«Хацемля — Аргуны» — кодавая назва карнай аперацыі нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць партызанскіх атрадаў 6-га «Марак» і 8-га імя М. М. Селіваненкі, партызанскай брыгады «Алексея», спецыяльнай групы пад камандаваннем У. Д. Сазонава і мясцовага насельніцтва 3 кастрычніка 1942 года ў Віцебскім, Суражскім і Лёзненскім раёнах. Праводзілася падраздзяленнямі 237-га ахоўнага батальёна, 13-га паліцэйскага палка СС з далучанымі да іх супрацьтанкавымі і мінамётнымі батарэямі на чале з камендантам Смаленска. Па плане штаба тылу групы армій «Цэнтр» аперацыя «Хацемля — Аргуны» разам з карнай аперацыяй «Маланка» павінна была ачысціць ад партызан передполле чыгункі Полацк — Смаленск. Раптоўнай атакай з поўначы і поўдня карнікі хацелі ўварвацца ў партызанскі лагер. Шэсць гадзін ішоў цяжкі бой. Сілы праціўніка ў чатыры разы пераўзыходзілі сілы партызан. Народныя мсціўцы пакінулі свае пазіцыі і з боем адышлі на паўночны захад. Не дасягнуўшы поспеху, карнікі падпалілі вёску Хацемля: 97 жыхароў расстралялі і каля 60 жанчын і дзяцей спалілі ў дамах, у вёсцы Кавалёва Суражскага раёна спалілі больш за 50 двароў і расстралялі 40 жыхароў.**



вызваленнем Лёзна ў кастрычніку 1943-га фашысты знішчылі апошнія дамы. З успамінаў жыхаркі вёскі Хацемля Аксініі Антонаўны Галцеевай: «У вайну я засталася з чатырма дзецьмі. Большаму было шэсць гадоў, а Кузьму, маленькаму, год. Муж пайшоў на фронт, я з дзецьмі і сваёй мамай гаравалі. Аднойчы ўбачыла, як аднавяскоўцы хаваюцца ў яму, адчула нешта нядобрае, пабегла ў дом, падхапіла сонных дзяцей і схаваліся ў падполлі. Сядзелі доўга і нічога не ведалі, што адбываецца ў вёсцы. Вылезла потым, паглядзела ў акно, а ўся вёска ў агні, усё гарыць, людзі крычаць. Я зноў да дзяцей — а тут наш дом загарэўся. Выкінула малых праз акно на вуліцу і пачала ўсё з дома выносіць. Тут паліцаі з'явіліся, быццам чакалі мяне: забралі ўсе нашы пажыткі, курэй, вопратку. Да вечара хадзілі па хатах і збівалі людзей. Цалкам загінула сям'я Гарашчанковых з чатырох чалавек, расстралялі Паўла Свірыдзенку, Еўдакію Міхайлоўскую і яе дзвюх дачок Пелагею і Фрузу з сынам Герай чатырох гадоў, Аляксандра Тамашова, спалілі Антона Дзямідава. Конюхаў нёс хаваць збожжа, яго таксама забілі. Праз тры дні зноў вярнуліся немцы і, што не згарэла, падпалілі зноў. Я з дзецьмі зімавала ў Забалоцці. Жыла ў доме Ганны Шырокавай, а ў сакавіку і Забалоцце спалілі. Выгналі ўсіх з дамоў, мужчын забілі, а нас разагналі. Жылі ў Пагосцішчы, вясной вярнуліся ў Хацемлю».

Жыхары Стасеўскага сельсавета адны з апошніх вярталіся да доўгачаканага мірнага жыцця, бо да чэрвеня 1944-га тут вяліся кровапралітныя баі за канчатковае вызваленне раёна. Некаторую колькасць людзей немцы гналі пад Мінск, праз вёску Кляўцы доўгі час праходзіла лінія абароны праціўніка. Мясцовыя жыхары вярталіся на зруйнаваную родную зямлю, якая стагнала ад бомбаў і снарадаў. Яшчэ раней, у 1943 годзе, былі спаленыя амаль усе партызанскія вёскі: Забалоцце, Вялікае Сяло, Асіпоўшчына, Канашкова, Шумшчына, Кляўцы, Смародзіна, Свірбы, Шарыкі, Пыжы, Бычкова, Навароцце і іншыя. Пра трагедыю вёскі Бычкова расказвала Дар'я Барысаўна Мініна 1907 года нараджэння: «Раніцай прыйшлі карнікі, вёска яшчэ спала. Усіх сталі выганяць на вуліцу, у шарэнгу выставілі. Мая дачка Галя ў кадку залезла, дык яе не ўбачылі. Навялі кулямёты на людзей, мужчын з шарэнгі забралі і павезлі кудысьці. Нас, баб, разагналі. Я з Лідай і Галяй адразу ў роў паляцелі, нічога з хаты не брала. Чуем, моцна трашчаць нешта пачало, а гэта немцы хаты падпалілі. Пад вечар двое мужчын вярнуліся, Мікалай і Метлякоў Васіль, яны на хаду выскачылі з машыны. А астатніх мужчын завезлі ў лес пад Цішковым, прымусілі яму сабе капаць, потым расстралялі і кінулі ў адну магілу, параненых і забітых. Расказвалі потым, што зямля некалькі дзён варушылася. А астатніх, што ў вёсцы заставаліся, восенню 1943 сагналі ў суседнюю вёску за кіламетр адсюль, загналі ў дзве пуні, нашых было каля сарака, а ўсіх — каля трохсот чалавек. Маму, Пелагею Васілеўну, айчыма, Яўсея Марозава, тады проста ў двары забілі. Маладых сясцёр Любку і Анютку таксама там паклалі. Анюціна дачка схавалася пад забітых, адна з усіх і засталася. Прывезлі яе ўсю ў крыві да мяне, я ў Юдзіне з дзецьмі жыла. Жылі ў ямах-акопах, наш фронт быў зусім блізка, у вёсцы Шарыкі. Тыдняў пяць сядзелі ў сваіх норах. На гару, пад якой мы сядзелі, немцы прывезлі свае гарматы, пачаўся страшны абстрэл. Снарады то пераляталі, то недаляталі. Мы аглухлі ад выбухаў. Ноччу на некалькі хвілін выбягалі са сваіх нор».

У маі-чэрвені 1943 года вогненная хваля дайшла да вёскі Слабада. Яе ўраджэнец Ігнат Антонавіч Красельшчыкаў 1870 года нараджэння ўспамінае, што быў сведкам многіх зверстваў фашыстаў, якія ўчынялі блізу райцэнтра Лёзна. Вёску Слабаду палілі адначасова з розных бакоў, абліўшы хаты і будынкі нечым гаручым. Людзей выводзілі з хат, тых, хто супраціўляўся, расстрэльвалі. Немцы рабавалі, забіралі ўсё, што трапляла на вочы: хатнюю жывёлу, збожжа, асабістыя рэчы вяскоўцаў.



Мемарыяльны комплекс у вёсцы Асташэва.

Такі ж лёс напаткаў і жыхароў вёскі Куракі, якія мелі цесныя зносіны з партызанамі. Немцы пачалі блакаваць населены пункт, хтосьці з людзей змог схавацца ў лесе. Астатніх жыхароў фашысты сабралі на плошчы, з агульнай шарэнгі адабралі частку па незразумелых прыкметах і сагналі ў хлеў. Там аказаліся цэлыя сем'і з дзецьмі, на вачах у астатніх будынак падпалілі. Тых, хто застаўся ў жывых, пагналі невядома куды, а вясковыя хаты немцы спалілі ўсе да адной. Шмат моладзі было сагнана ў Германію, на вачах у жанчын фашысты расстрэльвалі іх дзяцей...

### РАІ ГАЎРЫЛАВАЙ БЫЛО ЎСЯГО ДВА ГАДЫ

Дзень 30 верасня 1943 года стаў ракавым для 160 жыхароў вёскі Асташэва Лёзненскага раёна. Да вайны тут налічвалася 40 двароў і пражывалі каля 180 чалавек. Простая матэматыка падводзіць да жудасных фактаў: пасля вогненнай расправы карнікаў тут засталося каля 20 вяскоўцаў, у большасці сваёй гэта была моладзь, якая паспела схавацца ў лясах.

Асташэўцы не дачакаліся Чырвонай арміі ўсяго 11 дзён — 10 кастрычніка савецкія войскі вызвалілі райцэнтр. Разам з Асташэвам гарэлі і суседнія Запажонкі. Нечалавечая лютасць карнікаў была выкліканая партызанскай дыверсіяй напярэдадні: народныя мсціўцы з Калышанскай пушчы ўзарвалі каля вёскі мост, які вёў да шашы. Партызаны падарвалі варожыя аўтамашыны, забілі дзесяць немцаў і прыкладна столькі ж узялі ў палон. Жахары Асташэва прадчувалі бяду, бо фашысты асабліва жорстка дзейнічалі перад наступленнем савецкіх войскаў, таму адразу пасля дыверсіі вяскоўцы разам з каровамі і конямі перабраліся ў лес.

У вёску прыбыло каля 400 карнікаў, жыхароў пачалі выганяць на вуліцу. Калі ўсе вяскоўцы апынуліся ў коле стражнікаў з аўтаматамі, немцы рассыпаліся па хатах: на вачах людзей выносілі ўсё, што маглі знайсці. Падушкі, адзенне, швейныя машыны, мяшкі з мукой, сала і мяса — рабавалі тры гадзіны. Людзей загналі ў тры дамы, падпалілі... Тых, хто імкнуўся збегчы, забівалі і зноў закідвалі ў вогненнае пекла.

З успамінаў жыхара Асташэва Сяргея Мацвеевіча Голубава: «Мы ўжо тыдзень жылі ў лесе ў буданах і зямлянках, а ў вёсцы засталіся старыя і маленькія дзеці. Гітлераўцы адыходзілі, з боку Рубежніцы і ў Запажонках партызаны «замаскіравалі» падарунак — дзве міны, на іх і падарваліся нямецкія афіцэры. Пра ўсё гэта мы даведаліся пазней. Спачатку, перад Узвіжаннем, я прыйшоў дадому, каб памыцца ў лазні. Мама дала паснедаць, і я зноў пабег у лес. Праз некаторы час прыбегла Ганна Садоўская і кажа, што нас прапусцілі немцы, а з вашага канца не выпускаюць з вёскі. Праз гадзіны дзве Штылікава Лізка прыбегла: бачыла, як мужчын пагрузілі ў «чорны крумкач» (аўтамабіль, прызначаны для перавозкі зняволеных і арыштаваных), а астатніх загналі ў хлеў і дзве лазні. Ноччу мы бачылі агонь, чулі, як стракаталі кулямёты, думалі, што проста будынкі гараць. Потым з вёскі, у бок Гушчына, каля нас прайшоў конны абоз, але ісці ў вёску не адважыліся — тры дні яшчэ то ў адным, то ў другім баку вёскі былі агонь і дым, значыць, эсэсаўцы яшчэ не сышлі. Сядзім, чакаем, а тое, што людзей могуць паліць, і думкі не было. Калі перасталі гарэць хаты, я вырашыў паўзці на разведку: накінуў на сябе снапоў з аўса і асцярожна папоўз. Раптам, не ведаю адкуль, наша разведка ўзялася, дзевяць чалавек. Акружылі мяне і пытаюцца: «Сынок, ці шмат вас у лесе?», — кажу, што ўсе маладзейшыя тут, у лесе. «А каго там у вёсцы палілі?», — я аслупянеў, здавалася, валасы на галаве падняліся. Пабеглі ўсе ў вёску: на месцы дзвюх лазняў і хлява, што стаялі каля рэчкі, ляжалі абгарэлыя людзі і шмат костак. Маці сваю пазнаў па абрыўку шынялю пад ёй, яна ляжала каля печкі. Ніхто з агню не вырваўся, толькі Восіп Панасенка, Фёдар Карнілаў і Цімафей Барсукоў, адкаціўшыся метраў на 60 адзін ад аднаго, ляжалі абгарэлыя. Івана Кавалёва і дзеда Мікалая Лебедзева знайшлі прыстрэленымі над абрывам ракі — мабыць, уцякалі, калі ў лазні пачыналі заганяць. Пяць метраў не дабеглі да рэчкі. Плакалі і крычалі ўсе — у каго па сем, па дзесяць чалавек згарэла з сям'і, а на заўтра паехалі ў Запажонкі, прывезлі адтуль дзве шафы і куфар, сабралі ўсе костачкі, апусцілі ў яму. Засталіся, лічы, сіротамі, — адны падлеткі і моладзь. «Вёска сірот» — так называлі нас доўгі час у раёне. Каб выжыць, не памерці з голаду, сталі жаніцца, каму споўнілася 17 гадоў. У маёй жонкі згарэлі бацькі, чатыры сястры і два браты... Ніхто нікуды не раз'ехаўся ў пошуку лепшага жыцця, усе пачалі зноўку будавацца, нанова жыць».

У 1983 годзе на месцы трагедыі адкрылі мемарыяльны комплекс, у цэнтры якога ўзвышаецца белы манумент з выявай жанчыны-маці, што трымае на руках немаўля, а яе ногі гарачымі языкамі ліжа агонь. Наверсе — тры званы, якія на працягу 40 гадоў напамінаюць нам аб неймаверных пакутах, што перанеслі ні ў чым не вінаватыя мірныя жыхары. З двух бакоў ад цэнтральнага манумента — дзве мемарыяльныя пліты з прозвішчамі, сярод іх шмат аднолькавых — гінулі вялікімі сем'ямі. У той страшны вераснёўскі дзень абарвалася жыццё і двухгадовай Раі Гаўрылавай...

Пасля вайны вёска адбудавалася, яе ўзнімалі з руін тыя некалькі дзясяткаў чалавек, якім удалося выжыць. Аднак з цягам часу жыццё ў Асташэве пачало сціхаць, сёння ў населеным пункце засталося некалькі дамоў, але сцяжынка да мемарыяльнага комплексу ў цэнтры вёскі не зарастае: помнік стаў месцам смутку ў гонар усіх 196 населеных пунктаў Лёзненшчыны, якіх напаткаў вогненны лёс Хатыні. 28 з іх былі спаленыя разам з жыхарамі, тры — ужо ніколі не адрадзіліся.

Падчас падрыхтоўкі матэрыялу былі выкарыстаны архіўныя дакументы Лёзненскага ваенна-гістарычнага музея.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

*Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.*

# Извещение о проведении 23 **декабря** 2022 **года** торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

| № пред-мета торгов | Место размещения средства рекламы (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Количество и размер средства рекламы | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. (с учетом НДС) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Станция метро «Малиновка», ВБ-1 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 5 ед. | 2 367,40 |
| 2 | Станция метро «Октябрьская», ВБ-1 | Рекламный стенд без подсветки (растяжка над эскалаторным спуском) | 5,0 м × 1,5 м – 1 ед. | 291,24 |
| 3 | Станция метро «Площадь Победы», ВБ-1 | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 5 ед. | 973,60 |
| 4 | Станция метро «Немига», ВБ-1 (места: 217-1, 217-6, 217-7, 217-8, 217-9, 217-10, 217-11) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 7 ед. | 1 363,04 |
| 5 | Станция метро «Немига», ВБ-2 (места: 217-12, 217-13, 217-14, 217-15, 217-16, 217-17, 217-18) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 7 ед. | 1 363,04 |
| 6 | Станция метро «Первомайская», ВБ-2 (места 215-5, 215-7) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 2 ед. | 218,52 |
| 7 | Станция метро «Первомайская», ВБ-2 (места 215-4, 215-6) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 2 ед. | 218,52 |
| 8 | Станция метро «Молодёжная», ВБ-1 (места 219-2, 219-3, 219-4) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 3 ед. | 346,02 |
| 9 | Станция метро «Молодёжная», ВБ-1 (место 219-1) | Лайт-бокс | 2,25 м × 1,2 м – 1 ед. | 115,34 |
| 10 | Станции метро «Площадь Ленина», «Тракторный завод», «Фрунзенская», «Пушкинская» | Видеопроекторы без аудиоконтента с проекцией на своды маршевых лестниц | Видеопроектор с размером рекламного поля свыше 6,0 кв. м – 7 ед. | 1 560,00 |
| 11 | Станции метро «Институт Культуры», «Октябрьская», «Парк Челюскинцев» | Видеопроекторы без аудиоконтента с проекцией на путевые стены платформенных залов | Видеопроектор с размером рекламного поля до 6,0 кв. м – 12 ед. | 2 640,00 |

**Срок действия договора:** по предметам торгов № 1, 6, 7, 8, 9 – с 10 марта 2023 года по 9 марта 2028 года; по предмету торгов № 2 – с 5 января 2023 года по 4 января 2028 года; по предметам торгов № 3, 4, 5 – с 1 февраля 2023 года по 31 января 2028 года; по предметам торгов № 10, 11 – с 1 марта 2023 года по 29 февраля 2028 года.

**Материал изготовления средства рекламы:** по предметам торгов № 1, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9 – алюминиевый профиль, светодиодная лента, рассеивающая матрица, защитное оргстекло; по предмету торгов № 2 – баннерная ткань (способ крепления – талреп М12, металлический трос 5 мм)

**Форма проведения торгов** – аукцион.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Государственное юридическое лицо** – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

**Аукционные торги проводятся 23 декабря 2022 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).**

**Документы на участие в торгах принимаются с 23.11.2022 по 19.12.2022 включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.**

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – Соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающего принять участие в торгах.

*Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583 (назначение платежа – задаток для участия 23.12.2022 в торгах на право заключения договора на размещение средств рекламы по предмету торгов №_).*

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;
- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов, за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором на размещение средств рекламы);
- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – **www.metropoliten.by,** Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

# ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 628 | 93,60 | 9,36 | 4,68 |
| 2 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 707 | 139,20 | 13,92 | 6,96 |
| 3 | Огнетушитель ОУ-80, инв. № 708 | 139,20 | 13,92 | 6,96 |
| 4 | Станок хонинговальный 3Г833, инв. № 721 | 552,00 | 55,20 | 27,60 |
| 5 | Пневмомолот М41-32А, инв. № 750 | 960,00 | 96,00 | 48,00 |
| 6 | Мерник образ. М2Р-50, инв. № 1026 | 100,80 | 10,08 | 5,04 |
| 7 | Компрессор У-43102А, инв. № 6071 | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 8 | Полуприцеп КЕГЕЛЬ SN 24 74-24 АА-5, инв. № 19887 | 1512,00 | 151,20 | 75,60 |
| 9 | Ноутбук Samsung NP-R70, инв. № 480001 | 16,80 | 1,68 | 0,84 |
| 10 | Верстак слесарный 23 шт. (инв. номер 637), инв. № 637-658 | 1876,80 | 187,68 | 93,84 |
| 11 | Шкаф металлический 28 шт., инв. № 924-951 | 1344,00 | 134,40 | 67,20 |
| 12 | Стол для руководителя, инв. № 7007 | 64,80 | 6,48 | 3,24 |
| 13 | Металлические стеллажи, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10fWY96-jCQmPJ98wyn3JnlhH8ZNB-LOs/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 52,80 | 5,28 | 2,64 |
| 14 | Имущество, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/12RSNzANk4zPn9gMNobWpbiSaEVNDe9cK/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 262,97 | 26,30 | 13,15 |
| 15 | Имущество, согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1I3DDGZ38qGG4vGQnW-p4yIwmEbJeqb7t/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 112,60 | 11,26 | 5,63 |
| 16 | Имущество, согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/1grRy4m3qcP7qxoLsPHO3qRMVBPV4iSx_/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 105,60 | 10,56 | 5,28 |
| 17 | Кабина МАЗ | 1152,00 | 115,20 | 57,60 |
| 18 | Имущество, согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1HxadctxYycwzxTjXP_dBNU0ihvk7lXZ-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 121,60 | 12,16 | 6,08 |
| 19 | Автомобиль ГАЗ-2705, АР 6310-5, г. в. 1999 | 1008,00 | 100,80 | 50,40 |
| 20 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АК 0692-5, г. в. 2010 | 12852,00 | 1285,20 | 642,60 |
| 21 | Автомобиль «Фольксваген Шаран», 1244 ВН-5, г. в. 1995 | 2940,00 | 294,00 | 147,00 |
| 22 | Капитальное строение с инв. номером 630/С-49330 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание, общая площадь – 1 944,2 кв. м) | 408660,00 | 40866,00 | 20433,00 |
| 23 | Полуприцеп бортовой тентованный Metaco 334 SD, А 90-77 А5, 1994 г. в., инв. № 19674 | 3900,00 | 390,00 | 195,00 |
| 24 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АМ 9752-5, 2013 г. в., инв. № 010189 | 21372,00 | 2137,20 | 1068,60 |
| 25 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АI 7405-5, 2010 г. в., инв. № 12777 | 17628,00 | 1762,80 | 881,40 |
| 26 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АI 7407-5, 2010 г. в., инв. № 12751 | 17628,00 | 1762,80 | 881,40 |
| 27 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АК 0691-5, 2010 г. в., инв. № 10601 | 17628,00 | 1762,80 | 881,40 |
| 28 | Автомобиль МАЗ-551605-271, АМ 9753-5, 2013 г. в., инв. № 010197 | 21372,00 | 2137,20 | 1068,60 |
| 29 | Горизонтально-фрезерный станок 6082, инв. № 759 | 2574,00 | 257,40 | 128,70 |
| 30 | Станок ЗК-633, инв. № 1040 | 483,60 | 48,36 | 24,18 |
| 31 | Станок Р-105, инв. № 734 | 600,60 | 60,06 | 30,03 |
| 32 | Станок ЦКБ-Р335, инв. № 724 | 436,80 | 43,68 | 21,84 |
| 33 | Станция 0160-2, инв. № 1041 | 561,60 | 56,16 | 28,08 |
| 34 | Установка ЦКБ-Р-114, инв. № 719 | 1014,00 | 101,40 | 50,70 |
| 35 | Пресcножницы, инв. № 756 | 2652,00 | 265,20 | 132,60 |
| 36 | Компрессор 2ВУ1-25/13 м4, инв. № 771 | 1248,00 | 124,80 | 62,40 |
| 37 | Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 727 | 132,60 | 13,26 | 6,63 |
| 38 | Сварочный агрегат, инв. № 1082 | 226,20 | 22,62 | 11,31 |
| 39 | Сварочный агрегат, инв. № 1082а | 226,20 | 22,62 | 11,31 |
| 40 | Сварочный агрегат, инв. № 1082б | 226,20 | 22,62 | 11,31 |

В отношении лотов №№ 1–17 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 80 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15. В отношении лота № 18 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 144 (29766) от 26.07.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15. В отношении лотов №№ 19–22 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 4, № 165 (29787) от 24.08.2022, № 176 (29798) от 08.09.2022, стр. 6, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15. В отношении лотов №№ 23–40 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 35 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 165 (29787) от 24.08.2022, стр. 14, № 193 (29815) от 01.10.2022, стр. 14, № 213 (29835) от 29.10.2022, стр. 15

**Местонахождение лотов №№ 1–40: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2.**
Лот № 22 расположен на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право аренды Продавца (83/100 доли)

| | |
|---|---|
| **Ограничения (обременения)** | В отношении лота № 22: аренда помещений: 82,6 кв. м, 7,7 кв. м, 20,4 кв. м (по 31.12.2022), 12,9 кв. м (по 28.01.2023), 156,47 кв. м (по 10.01.2027), 34,3 кв. м (по 31.12.2025), 19,4 кв. м, 102,9 кв. м (по 31.12.2025). Земельный участок с кадастровым номером 642000000003000030 имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: код 5,1 – площадь 0,7390 га; код 5,2 – площадь 0,7390 га; код 5,5 – площадь 0,7390 га; код 5,7 – площадь 0,7390 га. **По вопросу обременений обращаться по тел. +375293489225** |
| **Дата и время проведения торгов** | **5 декабря 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **с 10.00 22 ноября 2022 года до 16.00 1 декабря 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901, задаток для участия в торгах по лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых 05.12.2022.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127.

Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по Лотам №№ 1–21, 23-40 – 7 %, по Лоту № 22 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Александр Николаевич, +375292627504. Дополнительная информация по лоту № 22 по тел. +375293042560, +375293082762.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», ☎ тел.: 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «ПРИЗЫ В ПРИЛОЖЕНИИ КАТАЛОГ ONLINER 2»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Призы в приложении Каталог Onliner 2» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Призы в приложении Каталог Onliner 2».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

4.1. Рекламная игра проводится с 28.11.2022 по 06.02.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится в целях стимулирования потребления услуг электросвязи путем скачивания и установки на мобильные устройства приложения Каталог Onliner (далее – Приложение), а также увеличения количества пользователей Приложения и повышения их активности.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Мартончик Евгений Григорьевич, ООО «Надо поговорить», директор;
- Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;
- Калинина Алена Николаевна, ООО «Онлайнер», начальник отдела продаж и ассортимента управления коммерции;
- Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, установившее на мобильное устройство приложение Каталог Onliner, успешно прошедшее авторизацию в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) и выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре в период с 28.11.2022 по 31.12.2022 Участнику необходимо:

8.1.1. войти в приложение Каталог Onliner, а в случае его отсутствия – предварительно установить на мобильное устройство Приложение (версия не ниже 2.12.0 в Google Play, не ниже 2.6 в App Store и не ниже версии 2.13.0 в AppGallery);

8.1.2. совершить в приложении Каталог Onliner переход на страницу входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо регистрации новой учетной записи (профиля), используя для этого баннер, расположенный на главной странице Приложения;

8.1.3. авторизоваться в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) на заявленных Организатором условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.4. в появившейся форме указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью, а также ознакомиться с Правилами проведения Рекламной игры и подтвердить свое согласие на участие в игре посредством проставления «галочки» в соответствующем поле;

8.1.5. активировать кнопку «Участвовать».

Владелец учетной записи (профиля) может активировать кнопку «Участвовать» один раз в течение соответствующего периода активации, указанного в п. 10.1 настоящих Правил.

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора в размере **13 534** (тринадцать тысяч пятьсот тридцать четыре) белорусских рубля **89** (восемьдесят девять) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС, % | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз 1 | Игровая приставка Sony PlayStation 5 | 3 | 2166,67 | 6500,00 | 20 % | 1300,00 | 7800,00 |
| | денежные средства в размере | | 364,45 | 1093,35 | – | – | 1093,35 |
| Приз 2 | Фен-стайлер Dyson Airwrap HS01 Complete (фуксия) | 2 | 1700,00 | 3400,00 | 20 % | 680,00 | 4080,00 |
| | денежные средства в размере | | 280,77 | 561,54 | – | – | 561,54 |
| **Итого:** | | | | | | | **13 534,89** |

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призов осуществляется в 5 (пять) туров в приведенном в таблице порядке:

| Номер тура | Дата и время проведения розыгрыша | Период активации в Приложении кнопки «Участвовать» | Приз розыгрыша |
|---|---|---|---|
| Тур 1 | 09.12.2022, в 12.15 | с 28.11.2022 по 04.12.2022 (23.59.59) включительно | «Приз 1» всего 1 (один) приз |
| Тур 2 | 16.12.2022, в 12.15 | с 05.12.2022 по 11.12.2022 (23.59.59) включительно | «Приз 2» всего 1 (один) приз |
| Тур 3 | 23.12.2022, в 12.15 | с 12.12.2022 по 18.12.2022 (23.59.59) включительно | «Приз 1» всего 1 (один) приз |
| Тур 4 | 30.12.2022, в 12.15 | с 19.12.2022 по 25.12.2022 (23.59.59) включительно | «Приз 2» всего 1 (один) приз |
| Тур 5 | 06.01.2023, в 12.15 | с 26.12.2022 по 31.12.2022 (23.59.59) включительно | «Приз 1» всего 1 (один) приз |

Розыгрыш призового фонда будет проводиться в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда и определения Победителей Рекламной игры**

11.1. К моменту начала проведения каждого розыгрыша призового фонда Организатор формирует список Участников (далее – Список), в котором каждому Участнику присваивается порядковый Игровой код в хронологическом порядке согласно дате и времени подтверждения Участником участия в Рекламной игре. В случае совпадения у Участников даты и времени активации кнопки «Участвовать» Игровые коды присваиваются по фамилии, имени, отчеству в алфавитном порядке. Нумерация Игровых кодов в Списке начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код; номер учетной записи (профиля) – Onliner ID; дату и время активации кнопки «Участвовать»; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрышей используются лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Каждый розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п.п. 11.3–11.5 настоящих Правил. В каждом туре разыгрывается 1 (один) приз.

11.7. Результаты каждого розыгрыша фиксируются в соответствующем протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Сроки и порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет Победителя о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Победителем при регистрации своей учетной записи (профиля) в приложении Каталог Onliner. Организатор также вправе дополнительно уведомить Победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер мобильного телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза Победители должны явиться не позднее 06.02.2023 (включительно) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10.00 до 17.00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 04.02.2023 с 10.00 до 13.00. При получении приза Победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, представленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с Победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1 способами; неявки Победителя за получением приза в определенный в п. 13.1 срок; указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; непредставления Организатору сведений и документов, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, – Победитель лишается права на получение приза. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении Победителю выигрыша обязан удержать у последнего причитающиеся денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя приза.

13.5. Расходы, связанные с проездом Победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 27.01.2023 (включительно) в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить в приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – Onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24. Звонок платный в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в публикациях, связанных с опубликованием результатов Рекламной игры в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner, а также на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (плохое соединение с оператором, отсутствие интернет-эквайринга и т. д.) и почтовых сервисов (несвоевременная доставка электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, а также посредством электронной почты – game_app2@onliner.by.

*Свидетельство № 4258 о государственной регистрации рекламной игры выдано 09 ноября 2022 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ВІКТОРЫЯ ВІКІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Мы пагутарылі з юнай спартсменкай пра эмоцыі падчас перамогі на сусветным першынстве, гульню з аматарамі, выбар віду спорту і якасці, важныя для добрага спартсмена.

***— Вікторыя, гэта твой першы тытул чэмпіёнкі свету?***

— Так. Гэта мой трэці дарослы чэмпіянат. Летась праходзіў чэмпіянат Еўропы ў Эстоніі. Там удалося заняць другое месца ў імгненнай праграме. Раней ездзіла ў Балгарыю на дарослы чэмпіянат свету. Выступаць на дарослых першынствах я пачала з 14 гадоў.

***— Разлічвала на поспех у Грузіі?***

— Хацелася, зразумела, паказаць свой найлепшы вынік, бо ўжо многа гадоў займаюся, шмат трэніруюся. Такога выніку не чакала. Разлічвала трапіць хіба што ў прызёры.

***— Калі ты зразумела, што перамога — твая?***

— Па ходу турніру ёсць пэўныя чаканні, але да апошняй партыі нельга расслабляцца. Бываюць турніры, калі за тур да канца зразумела, што ты чэмпіён. Гэта калі адрыў ад другога месца — тры ачкі, бо за перамогу ў партыі налічваецца толькі два. Але ў Грузіі ў мяне такога не было. Да таго ж быў спачатку папярэдні этап, а потым плэй-оф. Там нават калі маеш вялікі адрыў на папярэднім этапе, у плэй-оф дастаткова прайграць адну партыю, каб вылецець.

Я вельмі перажывала — не хацелася ўпусціць медаль у класічнай праграме, бо на папярэднім этапе я заняла першае месца.

***— Ты дастаткова юная чэмпіёнка. Ці ж у шашках гэта звычайны ўзрост для пераможцаў?***

— Я заняла першыя месцы ў катэгорыі сярод жанчын, а ў ёй неабмежаваны ўзрост. У асноўным гэта моладзь, самым моцным маім канкурэнткам ад 20 да 35 гадоў.

***— Раскажы, як праходзіла падрыхтоўка.***

— Перад чэмпіянатам свету я трэніравалася кожны дзень. Трэніроўкі праходзілі ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі. У нядзелю займалася дома самастойна. Падрыхтоўка ў асноўным такая ж, як і да іншых спаборніцтваў: спачатку я рашала камбінацыі, потым — пазіцыі, пасля — трэніровачныя партыі. І тэорыі даводзілася аддаваць увагу. У нас ёсць табліцы жараб'ёўкі: там першыя хады і 150 дэбютаў — варта было запамінаць вялікія аб'ёмы інфармацыі, каб у партыях потым было больш проста.

***— У якім узросце ты пачала займацца шашкамі?***

— Бацькі адвялі мяне на шашкі ў пяць гадоў. Мне цікава было з самага пачатку, бо няшмат дзяцей, якія добра гуляюць, і калі ты з самага пачатку пачынаеш перамагаць, хочацца працягваць далей і далей.

Звычайна бацькі аддаюць дзяцей у секцыю, калі яны ўжо ўмеюць або хадзіць, або расстаўляць шашкі. А я была тым дзіцем, якое не ўмела нічога. Мой трэнер быў здзіўлены, але вельмі хутка я дасягнула выніку.

***— Чаму бацькі абралі для цябе такі від спорту?***

— Мой тата, калі быў падлеткам, займаўся шашкамі, але потым кінуў. Цікава атрымалася,



што наш сусед па пад'ездзе з'яўляецца галоўным трэнерам нацыянальнай каманды па шашках. І мой тата ў дзяцінстве быў з ім знаёмы. Напэўна, гэта таксама паўплывала.

Сёння мой трэнер Віталь Аляксандравіч Аніська, з ім з пяці гадоў я займаюся шашкамі-64. Ёсць у мяне і другі трэнер, Ірына Сямёнаўна Пашкевіч, у яе я займаюся шашкамі-100.

***— Калі табе было 12 гадоў, у Санкт-Пецярбургу ты правяла сеанс адначасовай гульні з байкерамі, якія кінулі выклік вашаму віду спорту, назваўшы яго не вельмі сур'ёзным. Цяпер часта даводзіцца гуляць з аматарамі?***

— Тое мерапрыемства было накіравана больш на папулярызацыю нашага віду спорту. Відаў шашак насамрэч не два. У кожнай краіне ёсць свой від: бразільскія, турэцкія, чэшскія шашкі. Тыя ж шахматы — звыклы для ўсіх від спорту, ва ўсіх краінах адны і тыя ж правілы, але там і канкурэнцыя высокая. У шашках шмат відаў, і менш людзей гуляе.

Таму гэта было больш медыйнае мерапрыемства. Але партыі гуляліся па-сапраўднаму. Праходзіў сеанс, з усімі ўдзельнікамі, а іх было 12, мне трэба было гуляць адначасова.

Звычайна з аматарамі не вельмі шмат праблем. Усё ж такі чалавек, які займаецца, нашмат больш разумее ў шашках. Гэта такая гульня, у якую навучыцца гуляць дастаткова проста. А вось навучыцца гуляць добра — вельмі складана. Шмат камбінацый, і павінен быць вельмі добры разлік, каб выйграць.

***— Мянушка «Небяспечная Віка» з'явілася пасля турніру з байкерамі?***

— Не, крыху раней. У 2016 годзе якраз у Санкт-Пецярбургу праходзіў этап Кубка свету, мне тады было толькі 11 гадоў. Там я добра згуляла ў імгненнай праграме і сярод жанчын таксама заняла першае месца. З дарослымі саперніцамі было складана гуляць, але ў мяне была адна перавага: амаль ніхто мяне не ведаў. Усе лічылі мяне маленькай дзяўчынкай і разлічвалі, што партыя са мной будзе лёгкай прагулкай. А я змагла выйграць.

***— Якія якасці неабходныя для добрага гульца?***

— Важна быць вельмі працавітым, бо калі ёсць жаданне дасягнуць выніку, даводзіцца займаца шмат. Падчас партыі варта быць вельмі ўседлівымі, уважлівымі і добра падрыхтаванымі эмацыянальна. Напрыклад, у імгненнай праграме ўсе партыі гуляюцца запар, і пасля няўдачы важна ўмець сабрацца і працягваць далей. Прайграў партыю — адкінь негатыў і працягвай барацьбу.

***— Трэнер у гэты час можа дапамагаць і настройваць?***

— Звычайна трэнеры ездзяць з намі на спаборніцтвы, паміж партыямі да іх можна падыходзіць. Аднак так атрымалася, што ў Грузію мой трэнер не паехаў, мне давялося спраўляцца самой. Мы з ім, зразумела, штодзень звязваліся па «Вайберы», па класічнай праграме я з ім раілася. А вось у імгненнай, падчас якой нельга выходзіць ці размаўляць па тэлефоне, я магла разлічваць толькі на сябе.

***— Эмоцыі перашкаджаюць гульні?***

— Я хвалююся звычайна перад партыяй, а калі пачынаю гуляць, канцэнтруюся, і перажыванні знікаюць, я быццам бы ўсё кантралюю.

***— Статус і аўтарытэт саперніка цісне?***

— У Грузіі ў фінале я гуляла з чэмпіёнкай Расіі Нікай Леапольдавай. Яе тытул крыху прыгнятаў, бо гэта вельмі адказная партыя, фінал, і мне нельга прайграваць. Але калі я села за дошку, усё стала на свае месцы. У канцы яна мяне павіншавала, і я яе таксама.

***— Зразумела, што шашкі — гэта не покер, але ці можна на турнірах зарабіць?***

— Пераможцы чэмпіянату Беларусі едуць на чэмпіятат свету за кошт федэрацыі. На чэмпіянаце свету ў Грузіі быў свой прызавы фонд — 30 тысяч долараў, які дзяліўся на шэсць турніраў (тры сярод жанчын і тры сярод мужчын). І ўсе пераможцы атрымалі сваё грашовае ўзнагароджанне.

***— Колькі гадзін у дзень варта трэніравацца, каб стаць чэмпіёнкай свету?***

— Мая звычайная трэніроўка доўжыцца 2,5 гадзіны на дзень. Калі ідзе падрыхтоўка да нейкіх важных спаборніцтваў, такіх як чэмпіянат свету ці Еўропы, патрэбна больш часу — чатыры гадзіны і больш.

***— Ці ўзнікала калі-небудзь жаданне кінуць шашкі?***

— Такое бывае пасля няўдач на спаборніцтвах, калі дрэнна згуляла партыю ці мне не падабаецца вынік. Але тут важная эмацыянальная падрыхтоўка і ўменне сабрацца і працягваць турнір. Адны спаборніцтвы заканчваюцца — пачынаюцца іншыя, асабліва няма часу расстрайвацца.

***— Складана сумяшчаць шашкі і вучобу ў школе? Як праходзіць твой дзень?***

— Я вучуся ў 11-м класе гімназіі, і гэта сапраўды складана сумяшчаць. Мая раніца пачынаецца ў 7.30: я прачынаюся, збіраюся і іду ў гімназію. Пасля ўрокаў еду на трэніроўку, потым вяртаюся дадому і раблю дамашнія заданні. Хочацца, каб у атэстаце былі добрыя адзнакі, таму з урокамі часам сяджу да ночы. У суботу раніцай я іду на дадатковыя факультатывы, потым ізноў трэніроўка, пасля раблю хатнія заданні. Нядзеля — адзіны дзень, калі я нікуды не іду. Але трэніруюся дома.

***— Ці прыходзіцца прымушаць сябе трэніравацца?***

— Зразумела, асабліва з такім шчыльным графікам. Пасля вучобы вельмі хочацца дадому, адпачыць і паспаць, але каб паляпшаліся вынікі, неабходна трэніравацца. І пакуль мне гэта цікава.

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## ФІЛАТЭЛІСТЫ З СЯМІ КРАІН ПРАДСТАВІЛІ СВАЕ КАЛЕКЦЫІ НА ВЫСТАЎЦЫ Ў БРЭСЦЕ

**Філатэлісты з сямі краін прадставілі свае калекцыі на міжнароднай выстаўцы «Брэст-2022». Яна прысвечана 80-годдзю Брэсцкай крэпасці і паўвекавому юбілею Паста Памяці, паведаміў карэспандэнту БелТА старшыня Брэсцкага аддзялення Беларускага саюза філатэлістаў Леанід ТУРЫН.**

Выстава разгарнулася ў выставачнай зале абласнога грамадска-культурнага цэнтра. На ёй прадстаўлены 65 работ. Гэтыя калекцыі належаць юным і ўжо вопытным філатэлістам з Беларусі, Польшчы, Расіі, Арменіі, Малдовы, Ізраіля і ЗША.

«У нас пяць членаў журы. Тры з іх — з Беларусі, два — з Расіі. Яны даволі высока ацанілі работы. Дзве ўдастоены Гран-пры: брастаўчаніна Віктара Копыця і масквіча Ігара Рыся. Многія ўдзельнікі атрымалі пазалочаныя і залатыя медалі. Некаму ўручылі асабіста. Тым, хто не змог прыехаць, па пошце вышлем узнагароды і каталогі выставы», — расказаў Леанід Турын.

Большасць экспанатаў на выставе прысвечаны ваеннай і гістарычнай тэматыцы. Напрыклад, філатэліст з Масквы прывёз у Брэст арыгінальную калекцыю «Вайна 1941—1945 гадоў вачамі дзяцей». Яму ўдалося сабраць каля 100 пісем дзяцей з Савецкага Саюза, Вялікабрытаніі, ЗША. Гэтыя пасланні дзеці адпраўлялі сваім татам і дзядам на фронт. У пісьмах дзеці няўпэўненым почыркам віншавалі родных са святамі, пакідалі малюнкі. «Моладзі і дзецям мы дазволілі паказаць тое, што яны збіраюць. Напрыклад, у іх калекцыі аб прыродзе Беларусі, спорце, космасе», — растлумачыў субяседнік.

Дарэчы, самым юным аўтарам філатэлістычнай выставы 13-14 гадоў. Самаму вопытнаму калекцыянеру споўнілася 84 гады.

Арганізатары выставы — Беларускі саюз філатэлістаў, Брэсцкі гарвыканкам, РУП «Белпошта», мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», абласныя грамадска-культурны цэнтр і камітэт ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, працы і Узброеных сіл.

Агляды часопісаў — 2022: «Маладосць». Кастрычніцкі нумар

## АД РАМАНТЫКІ ДА РЭАЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

**Моладзь, літаратурную асабліва, часта папікаюць: маўляў, адарваліся ад жыцця, знаходзяцца ў свеце фантазій... Чытаючы кастрычніцкі нумар літаратурна-мастацкага часопіса «Маладосць» за 2022 год, пераконваешся, што аўтары гэтага выдання аднолькава добра адчуваюць сябе ў розных фарматах існавання, бачаць рэальнае жыццё і не чужыя фантазійным памкненням.**

Празаік з Беразіна Алесь БЫЧКОЎСКІ выступае з аповесцю «Зачараваная шафа». Аўтар запрашае чытача наведаць плоскасць Мёбіуса. Адкрывайце часопіс і спяшайцеся следам. Мне здаецца, што не пашкадуеце. «Маладосць» працягвае друкаваць цыкл фантастычных апавяданняў Сяргея БЕЛАЯРА з Брэста — «Трыбунальная Інстыгаторыя». Аўтар вядомы, друкуецца не толькі ў «Маладосці». У 2019 годзе быў адзначаны за сваю творчасць літаратурнай прэміяй Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта імя Уладзіміра Калесніка. Сяргей Белаяр — аўтар кніг «Шчыт Персея» і «Расследаванні інспектара Сарвы».

Паэзія ў «Маладосці» носіць больш рэалістычны характар. Гэта пацвярджаюць падборкі ўрача-ангіяхірурга з Мінска Зміцера КРЭСА («Я пуціны свае не кідаю...»), бібліятэкара з Салігоршчыны Ірыны КРЫВАШЛЫКАВАЙ («Там жыве маладая вясна...»), дацэнта кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання факультэта журналістыкі БДУ Пятра ЖАЎНЯРОВІЧА («Шчасце табе адгукнецца»), настаўніка беларускай мовы і літаратуры з Полацка Іны МАРОЗ («Карункавы рукапіс»).

Асобна ў кастрычніцкім нумары вызначаецца падборка твораў студэнтаў, якія займаюцца мастацкай літаратурай, — «БрамаМар». Пачатак гэтай падборкі быў у папярэднім нумары. У кастрычніцкім друкуюць свае творы Іван МЕЛАЎ, Вераніка ГОРМАШ, Віталь МІНКОЎСКІ. Усе яны выступаюць з празаічнымі тэкстамі.

У раздзеле «Пераклады» — апавяданні англійскага пісьменніка Фрэдэрыка Джозэфа МАРЫЕТА (1792—1848) у перакладзе студэнткі 5 курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Настассі ЗАЯЦ. Дапамагала ёй рыхтаваць пераклады да друку кандыдат філалагічных навук, дацэнт Марына МАКАРЫЧ.

Кастрычніцкі нумар прапануе чытачу тэксты пра выяўленчае мастацтва і музыку, а таксама анкету




«Калі б я быў галоўным рэдактарам...». Цікавым падаецца артыкул Лады АЛЕЙНІК «Рамантык-ідэаліст», прысвечаны зборніку прозы Алеся БАДАКА «Ідэальны чытач».

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Нястрачаная спадчына

# КУЛЬТУРНЫЯ КОДЫ

## «Каменныя дзевачкі», «калядныя цары», саламяныя цуды — усё гэта ў нас ёсць

**«У гэтых караваях сямі палёў пшаніца, сямі вадзіц крыніца. На шчырасці замешаны і на сяброўстве печаны», — з такімі словамі жанчыны з аматарскага аб'яднання «Чараўніцы-каравайніцы» знаёмілі са сваімі гасцявымі і кулінарнымі традыцыямі на рэспубліканскай выстаўцы па нематэрыяльнай спадчыне, якая ладзілася ў Музеі гісторыі горада Мінска. Жанчынам даручылі сустрэць удзельнікаў міжнароднага семінара «Захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны краін СНД у кантэксце глабальных выклікаў».**



### Здабыткі

Такая маштабная, агульнарэспубліканская выстаўка, падчас якой на адной плошчы была прадстаўлена інфармацыя, што датычыцца захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны, у Беларусі праходзіць упершыню. Звычаі, святы, традыцыі, веды і навыкі, рамёствы прадстаўлялі іх носьбіты, удзельнікі народных калектываў, народныя майстры, музейныя супрацоўнікі. Яны распавядалі пра элементы, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі. Дарэчы, сёння ў яго ўнесены 164 аб'екты, за якімі стаіць больш як тысяча носьбітаў.

Кожная вобласць старалася максімальна разнастайна паказаць свае народныя скарбы. Толькі Гродзеншчына прадставіла 18 элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Сярод іх сапоцкінскія пісанкі — адметная традыцыя распісвання велікодных яек чорнабелым узорам. Фарба на працягу трох месяцаў настойваецца на кары дуба і жалезных цвіках. З выкарыстаннем сухіх кветак



на Гродзеншчыне ўпрыгожвалі галінкі вярбы. Мастоўскі раён прадставіў падвойнае ткацтва. У такой тэхніцы выконваюцца нават сучасныя габелены з выявамі архітэктурных помнікаў. Спецыяліст Лідскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці Ірына Дыдышка збірала матэрыял аднosна традыцый, пакінутых нам продкамі, і аднавіла вясельныя касцюмы. Простае двухнітовае ткацтва, якое зберагаецца ў Ваўкавыску, дае ўяўленне аб тым, з якой тканіны нашы бабулі і дзядулі рабілі адзенне...

На выстаўцы адбываліся і майстар-класы. Так, можна было паспрабаваць разам з народным майстрам Наталляй Клімко з Навагрудчыны зрабіць выбіванку — незвычайную выцінанку, якая не выразаецца нажнічкамі, а менавіта выбіваецца пры дапамозе малаточка і долата. Майстры з Дрыбіншчыны вучылі плесці лапці з лыка. Гаспадыні з Маларыты спецыяльна для выстаўкі прывезлі грачаны хлеб. Традыцыя яго выпякання ў Дзяржаўным спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны замацавана ў 2020 годзе. Без грачанікаў у Маларыцкім раёне не абыходзіцца ніводная ўрачыстасць. Іх пякуць на вяселлі і юбілеі. А ў гады вайны менавіта рэцэпт бабуль дапамог мясцовым жыхарам выжыць, бо іншага зерня ў той час не хапала. Першая ж згадка пра выпяканне з грачанай мукі адносіцца да XVIII стагоддзя!

Са сваім хлебам на выстаўку прыбылі і госці з Любаншчыны. Традыцыя выпякання тут не перарывалася ніколі. Нават у савецкія часы, калі ржаную муку (а, па мясцовых рэцэптах, яна абавязкова дадаецца ў цеста) немагчыма было дастаць, жанчыны куплялі жытні хлеб, размочвалі яго, змешвалі з цестам і перапякалі на свой густ. Сёння традыцыя выпякання хатняга хлеба захоўваецца ў вёсках Кузмічы і Жораўка Любанскага раёна, але паступова рэцэпты пераймаюць гаспадыні і з іншых населеных пунктаў. Ужо гараджане спрабуюць яго выпякаць дома і нават кладуць у духоўку маленькія кавалачкі цэглы — каб дадаць хоць крыху «пячнога» паху.

Выстаўка была багатая на цікавыя сустрэчы. Так, абрад «Калядныя цары», унесены ў сусветны спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА, прыехалі прадстаўляць былыя «цары» Максіміліян і Мамай, дакладней, мужчыны, якія выконвалі іх ролі, калі ў 1996 годзе абрад пачаў адналяцца. З якой радасцю і ўдзячнасцю яны віталі сваю «хросную маці» Таццяну Кухаронак! Менавіта дзякуючы дапамозе гэтай вучонай з Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ўнікальны абрад Міншчыны быў адроджаны і прызнаны на міжнародным узроўні. Семежава славіцца і сваімі ткацкімі традыцыямі. Так, адвеку тут рабілі чырвона-белыя ручнікі ў тэхніцы закладнога ткацтва. Асноўны ўзор закладваўся так званымі матрушкамі — наматанымі ніткамі, а белае палатно ткалася ў шахі (асаблівае перапляценне). Кожны ўзор меў сваю назву (сёння вядома каля 20): «арол», «дзяды», «арловы ножкі», «белая зорка», «парогі», «бярозавы лісток», «грабяні», «лупач».

**За кожным абрадам стаяць гісторыя пэўнага рэгіёна, уклад жыцця, гісторыі і мары розных пакаленняў, павага да спадчыны.**

У экспазіцыі можна было ўбачыць копію абраза з Будслава, мотальскі вясельны каравай, жлоб — адметную батлейку з Віцебшчыны, саламяны і ганчарныя вырабы, выцінанкі, даведацца пра абрады, рамёствы і адмысловыя практыкі, у тым ліку пра тэхніку вырабу рыпяцкага чаўна, якая сёлета ўвайшла ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Дарэчы, выстаўка ладзілася ўжо ў канцы міжнароднага навукова-практычнага семінара, прысвечанага захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны, арганізатарам якога выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. Госці з Арменіі, Казахстана, Кыргызіі, Узбекістана, Таджыкістана не хавалі эмоцый, казалі што яны «патанулі» ў гэтым моры любові да нацыянальных традыцый і ведаў; пазначалі для сябе цікавыя падыходы па ахове спадчыны, прыкмячалі, чым падобныя і чым адрозніваюцца народныя традыцыі.

### Традыцыі і пераемнікі

Шмат адкрыццяў госці зрабілі і падчас канцэрта «Традыцыі і пераемнікі», які напярэдадні прайшоў на базе аднаго з арганізатараў мерапрыемства — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, куды прыехалі аўтэнтычныя і дзіцячыя ды маладзёжныя калектывы з розных рэгіёнаў краіны. Дарэчы, такая прэзентацыя спеўнай, танцавальнай і абрадавай спадчыны ў Беларусі зноў-такі ладзілася ўпершыню. Народны фальклорны ансамбль «Галасы Спадчыны» з Полацкага раёна прадставіў характэрнае толькі для іх рэгіёна выкананне купальскіх і жніўеньскіх песень. Фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Таняжанка» выканаў народную заклінальную песню, запісаную ў Лельчыцкім раёне ад жанчыны 1911 года нараджэння. Носьбітамі нематэрыяльнай гістарычна-культурнай каштоўнасці — абраду «Правідэмо зіму» — з'яўляюцца жыхары вёскі Пінкавічы.

А яшчэ ўдзельнікі канцэрта пазнаёмілі гасцей з абрадам «Правады русалкі» і «Куры» (у апошнім на Каляды ўдзельнічалі дзяўчынкі да 14 гадоў, якія з песнямі абыходзілі вясковыя двары і жадалі дабрабыту гаспадарам). Беларускія песні і танцы разам з народнымі калектывамі прадстаўлялі студэнты ўніверсітэта культуры.

### Пошук

Галоўныя задачы семінара, які сабраў даследчыкаў у галіне аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны краін СНД, — пошук шляхоў захавання здабыткаў, якія стагоддзямі назапашваліся народам, пашырэнне рэгіянальнага супрацоўніцтва ў галіне іх захавання і папулярызацыі, што будзе спрыяць падтрымцы культурнай разнастайнасці і развіццю міжкультурнага дыялогу.



Беларускія ўдзельнікі семінара адзначылі, што сёння ў краіне шмат робіцца для захавання, фіксацыі, вывучэння, перадачы, а таксама прымнажэння гісторыка-культурных каштоўнасцяў і традыцый, якія з'яўляюцца сімвалам нацыянальнай ідэнтычнасці, своеасаблівым кодам беларускай нацыі. І тут справа не абмяжоўваецца толькі падтрымкай носьбітаў, важную ролю пачынае адыгрываць адукацыя. Важна як перадаваць дзецям веды ў цэнтрах дадатковай адукацыі, так і інтэграваць у вучэбныя праграмы навучальных устаноў. Пашырэнне традыцыйных ведаў адбываецца і дзякуючы фестывалям народнай творчасці, стварэнню нацыянальна-культурных брэндаў, распрацоўцы новых экскурсійных маршрутаў. І, тым не менш, у галіне аховы нематэрыяльнай спадчыны яшчэ багата праблем.

«Урбанізацыя, старэнне насельніцтва альбо суб'ектыўныя, неабдуманыя рашэнні нясуць пэўную небяспеку і рызыку, што можа пагражаць захаванасці альбо пераемнасці традыцый, ведаў, навыкаў і ўменняў», — заўважыў **кансультант аддзела арганізацыі аховы і ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцяў упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры РБ Генадзь ХОДАР.**

**Загадчыца аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна ВАЛОДЗІНА** прывяла прыклад, як няведанне пэўных абрадаў можа пагражаць іх знікненню. Напрыклад, такая пагроза ўзнікла ў дачыненні ўшанавання «каменных дзевачак». Спрадвеку ў некаторых беларускіх вёсках было прынята апранаць каменныя крыжы, у выніку чаго тыя нагадвалі жаночыя фігуры. Калі раней пры царкве служылі людзі, знаёмыя з мясцовымі традыцыямі і паданнямі, якія спакойна ставіліся да падобных народных практык, то сёння новыя святары, якія арыентуюцца выключна на ўласныя царкоўныя веды, спрабуюць спыніць абрады, якія ім падаюцца паганскімі, загадваюць прыбіраць убранні з камянёў. Насамрэч за кожным абрадам стаіць гісторыя пэўнага рэгіёна, уклад жыцця, гісторыі і мары розных пакаленняў, павага да спадчыны, якая перадавалася ад дзядоў, пошук самаідэнтыфікацыі жыхароў менавіта гэтай мясцовасці. Таму так важна папярэджваць падобныя канфлікты.

Сур'ёзнай праблемай для захавання пэўных абрадаў з'яўляецца памяншэнне вясковага насельніцтва. Нематэрыяльная спадчына можа знікаць, калі адыходзяць носьбіты. Часам і празмерная ўвага да абрадаў таксама можа несці пагрозу. Важна, каб рэканструктары не прыпісвалі аб'ектам сэнсаў, якіх раней не было, не ладзілі касцюміраваных шоу і канцэртаў у мясцінах, якія продкі ўшаноўвалі, лічылі святымі. Натоўпы турыстаў могуць прынесці шкоду і прыродзе.

Сёння ў Беларусі вялікая ўвага ўдзяляецца перадачы ведаў, навыкаў і ўменняў дзецям. Але як зацікавіць малых на занятках, напрыклад, саломапляценнем, калі існуе столькі навамодных сучасных гурткоў накшталт IT і робататэхнікі? Уключэнне ў ахоўны спіс таксама можа спрыяць росту цікавасці да традыцыйных заняткаў. Так, сёння малым можна сказаць, што яны робяць з саломкі аб'екты нематэрыяльнай спадчыны, а не проста саламяных павукоў ці лялек. Традыцыі саломапляцення на Беларусі, якія ўжо ўваходзяць у дзяржаўны ахоўны спіс, пададзены для ўключэння ў спіс сусветнай культурнай спадчыны, і ў найбліжэйшы час гэта заяўка будзе разглядацца на 17-й сесіі Міжурадавага камітэта па ахове нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

## БЕЛАРУСБАНК

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Изолированное помещение № 100/D-13919 Изолированное помещение № 100/D-13920 (изолированные помещения продаются единым лотом)** |
| **Место-расположение объекта** | г. Малорита, Заводская, 14-39<br>г. Малорита, Заводская, 14-40 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Брестское областное управление № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Площадь** | 55,0 кв. м<br>58,3 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | 59 660,64 руб. (пятьдесят девять тысяч шестьсот шестьдесят руб. 64 коп.) |
| **Сумма задатка** | 5 966,00 руб. (пять тысяч девятьсот шестьдесят шесть руб. 00 коп.) |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым № 125250100001000674, с площадью 0,4261 га |
| **Характеристика объекта** | Стены – кирпичные, перекрытие – плиты железобетонные, пол – плитка, окна – ПВХ, двери – ПВХ, электроснабжение, естественная вентиляция |
| **Условия оплаты** | По договоренности победителя аукциона с собственником имущества |

**Аукцион состоится 08 февраля 2023 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9 этаже.**

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409. **до 16.00 06 февраля 2023 года.**

Для участия в аукционе к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с **BY69AKBB66708597000020000000**, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

